Эмоцыі і фінансы не сумяшчальныя

СТАР. 2

Хто адкажа за банкет?

СТАР. 3

Скарыстацца шанцам не позна

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 ВЕРАСНЯ 2014 г. СЕРАДА № 171 (27781) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЛЕПШ МЕНШ, ДЫ ЛЕПШ

На працягу двух гадоў будуць цалкам мадэрнізаваны прадпрыемствы гарбарнай галіны, пры гэтым іх колькасць плануецца скараціць удвая

Пра гэта ішла размова падчас наведвання Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам ААТ «Мінскае вытворчае гарбарнае аб'яднанне» ў пасёлку Гатава, паведамляе БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

«На працягу наступнага і 2016 года мы цалкам мадэрнізуем і створым канкурэнтаздольнае, высокага ўзроўню прадпрыемства, якое будзе здольна перапрацаваць усю скурсыравіну», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Гарбарная галіна краіны сёння прадстаўлена чатырма прадпрыемствамі: Бабруйскім гарбарным камбінатам, Гродзенскім вытворчым гарбарным аб'яднаннем, Мінскім вытворчым гарбарным аб'яднаннем і ААТ «Гарбар». Плануецца, што ў выніку пераўтварэнняў застануцца два прадпрыемствы: у Мінску і Бабруйску, аднак і яны будуць на 20-25% недазагружаныя. «Перад вамі будзе стаяць задача загрузіць астатнія магутнасці. Хоць адкрывайце цэх і шыйце, галоўнае, каб маглі прадаць. Трэба думаць, што вы яшчэ тут будзеце вырабляць», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да работнікаў мінскага прадпрыемства.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў лістападзе 2012 года на ўзроўні кіраўніка дзяржавы абмяркоўваліся перспектывы гарбарнай вытворчасці. «Паўстала пытанне, у што апранаць людзей: у кітайскае, турэцкае, або будзем вырабляць сваё? Было прынята рашэнне, што будзем вырабляць сваё. Гэта значыць, што ўся скура, якую атрымліваем, павінна быць перапрацавана ў краіне і з яе мы павінны шыць гатовы тавар: адзенне, абутак , галантарэйныя тавары», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў насцярожанасць тым, ці не пойдзе працэс мадэрнізацыі ў гарбарнай галіне па прыкладзе дрэваапрацоўкі. Аднак кіраўніка дзяржавы запэўнілі, што ў 2016 годзе яна будзе завершана.

Гаворачы пра аднаго з асноўных спажыўцоў гарбарнай галіны — абутковыя прадпрыемствы, Прэзідэнт нагадаў, што яны следам за гарбарнымі таксама мадэрнізуюцца. У выніку будуць створаны сучасныя прадпрыемствы па выпуску гатовых вырабаў.

«Мы не павінны загубіць сваю вытворчасць, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Кітай — гэта добра, але нам трэба вырабляць сваё, тым больш мы ўмеем гэта рабіць».

«Мы павінны ўзняць сваю вытворчасць, апрануць, абуць у сваё, сучаснае, каб людзі маглі ганарыцца беларускім абуткам», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў кастрычніку ў Віцебску будзе праведзена нарада, на якой будзе разгледжаны стан спраў у абутковай галіне, як ажыццяўляюцца праекты пашырэння аб'ёмаў вытворчасці і мадэрнізацыі.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся са станам спраў на МВГА, агледзеў цэхі прадпрыемства, выстаўку прадукцыі.

Прэзідэнт таксама пагутарыў з работнікамі прадпрыемства.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што наведвае яго, каб пракантраляваць, як выконваюцца раней прынятыя рашэнні, вядзецца працэс мадэрнізацыі. Прэзідэнт звярнуў увагу на паляпшэнне фінансавага становішча прадпрыемства. Ён падкрэсліў, што пры такой тэндэнцыі будзе расці і заработная плата работнікаў.

Адно з пытанняў датычылася ўкраінскай тэматыкі. Беларусь зацікаўлена ў тым, каб не было эскалацыі канфлікту ў Украіне, заявіў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што Беларусь можа працаваць толькі на мір ва Украіне.

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на ролі інфармацыйных войнаў, якія адбываюцца сёння, у тым ліку ва ўкраінскім канфлікце. «Сёння гэта не тая вайна, што была калісьці, ідзе інфармацыйная вайна. Не бойцеся інфармацыйных войнаў, слухайце ўсё і дзяліце на 10», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што ў Беларусі будзе спакойная сітуацыя: «Калі ў нас у эканоміцы будзе нармальна, калі нашы людзі будуць занятыя справай, тады і мірна будзе ў краіне. Трэба жыць у сваёй краіне і займацца мірнай справай».

ШКОЛА ЮНЫХ КІРОЎЦАЎ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксей ДАЙНЕКА, дырэктар Інстытута эканомікі НАН:

«Грашовыя даходы насельніцтва краіны растуць, за апошнія пяць гадоў сярэднегадавы прырост рэальнай заработнай платы перавысіў 10%, што дазваляе мінімізаваць негатыўны ўплыў прапанаванага павелічэння стаўкі падаходнага падатку з 12% да 13% на ўзровень жыцця насельніцтва. Дарэчы, стаўка падаходнага падатку ў Расіі, якая з'яўляецца асноўным эканамічным партнёрам Беларусі, складае 13%, а ў многіх краінах з рынкам, які фарміруецца, вызначана плоская шкала падаходнага падатку з больш высокімі стаўкамі, у прыватнасці ў Чэхіі (22%), Латвіі (24%), Літве (15%). На гэтым фоне стаўка ў 13% выглядае даволі ўмеранай».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.09.2014 г.

Долар ЗША	10470,00	■
Еўра	13480,00	▼
Рас. руб.	283,00	▲
Укр. грыўня	802,30	■

■ Жыллё

ДЗЯРЖЗАКАЗ ГАРАНТУЕ

Падрыхтаваныя спецыялістамі Мінбудархітэктуры новаўвядзенні павінны цалкам выключыць праблему даўгабудаў

Фота БЕЛТА.

Будаўнічая галіна ў нашай краіне даволі актыўна развіваецца. У сферы будаўніцтва жылля пачалі выкарыстоўвацца не толькі новыя метады ўзвядзення дамоў, але і змяніліся прынцыповыя падыходы да «чаргавікоў». Пра гэта і многае іншае, адказваючы на пытанні карэспандэнта нашага выдання, расказаў начальнік управлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр ГОРВАЛЬ.

— Аляксандр Вітальевіч, сёлета ў нашай краіне пачала дзейнічаць сістэма дзяржзаказу. На першы погляд, механізм гэты зразумелы, але ў нашых чытачоў застаюцца пытанні... Растлумачце ўсе плюсы ці мінусы гэтай сістэмы.

— Адразу заўважу, што сёння будаўніцтва па дзяржзаказе тычыцца тых людзей, якія і раней атрымлівалі жыллё з дзяржпадтрымкай праз сістэму льготнага крэдытавання. Цяпер на першым этапе гэтыя льготныя крэдыты выдаюцца ўжо не людзям, а ўпраўленням капітальнага будаўніцтва. Такія структуры будуюць за крэдытныя грошы жылыя дамы, якія потым прапануюцца насельніцтву. Дом будуецца, а мясцовыя выканкамы фарміруюць адпаведныя спісы чаргавікоў, якія маюць права атрымаць жыллё па дзяржзаказе. Толькі пасля здачы дома ў эксплуатацыю людзям прапануюць набываць падобнае жыллё па дагаворах куплі-продажу з УКБ. Потым чалавек афармляе ў Беларусбанку льготны крэдыт ужо на сваё імя на тых умовах, якія прадугледжаны па Указе кіраўніка дзяржавы № 13.

СТАР. 7

■ Абмяркуем

ПРАБЛЕМЫ АДУКАЦЫІ — У ЦЭНТРЫ ЎСЕАГУЛЬНАЙ УВАГІ

Урад даў старт грамадскай дыскусіі аб развіцці адукацыі ў нашай краіне

Рабочую групу для ажыццяўлення комплекснага аналізу сістэмы адукацыі ўзначаліў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль ТОЗІК. У яе склад увайшлі вучоныя-практыкі, кіраўнікі ўстаноў адукацыі, прадстаўнікі рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Нам трэба з удзелам грамадскасці, педагагічных калектываў, бацькоў правесці комплекснае і ўсебаковае вывучэнне ўсіх звёнаў адукацыйнай сістэмы, выявіць праблемныя пытанні і вызначыць шляхі іх вырашэння, — падкрэсліў Анатоль Тозік у сваім выступленні на арганізацыйным пасяджэнні рабочай групы.

Па словах віцэ-прэм'ера, выпрацаваныя рабочай групай прапановы будуць улічаны пры дапрацоўцы Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. Гэта дазволіць стварыць прававое поле для ўдасканалення сістэмы адукацыі на бягучым этапе і на перспектыву.

Анатоль Тозік зазначыў, што ўвагі патрабуюць пытанні эфектыўнага інтэлектуальнага і фізічнага развіцця навучэнцаў, працоўнага выхавання дзяцей, фарміравання прыкладнога практыка-арыентаванага зместу адукацыі на ўсіх узроўнях падрыхтоўкі.

У рамках рабочай групы ён прапанаваў таксама абмеркаваць эфектыўнасць падрыхтоўкі педагагічных кадраў і павышэння прэстыжу іх працы, пераход на нарматыўнае фінансаванне ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, пераемнасць у атрыманні адукацыі на розных узроўнях, развіццё прыватна-дзяржаўнага партнёрства і іншыя пытанні.

Прапановы па пытаннях развіцця і ўдасканалення адукацыі можна накіроўваць на спецыяльны паштовы адрас урада Рэспублікі Беларусь **obrazovanie@government.by і на Нацыянальны адукацыйны партал www.adu.by (раздзел «Інфалінія»)**.

Надзея НІКАЛАЕВА

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Аддзяленне Шатландыі палохае НАТА

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Дэвід Кэмеран распавёў пра тое, што некаторыя лідары НАТА выказалі сур'ёзную занепакоенасць у сувязі з магчымым аддзяленнем Шатландыі. Перспектыва абвяшчэння незалежнасці гэтай часткі Вялікабрытаніі з кожным днём становіцца ўсё больш рэальнай.

Шатландыя рыхтуецца да правядзення рэферэндуму 18 верасня, у выніку якога можа быць абвешчана аб незалежнасці рэгіёна. Пры гэтым раней каралеўскі двор заяўляў, што не разлічвае на нязручныя для сябе вынікі галасавання. Аднак чым бліжэй рэферэндум, тым большую ступень занепакоенасці праяўляюць улады каралеўства. Цяпер магчымае аддзяленне Шатландыі палохае не толькі Вялікабрытанію, але і кіраўніцтва Паўночнаатлантычнага альянсу.

Кіраўніцтва Абамы прызналі правалам

Большасць грамадзян ЗША прызналі прэзідэнцтва цяперашняга кіраўніка Белага дома правалам.

Так, на пытанне «Як вы лічыце, прэзідэнцтва Абамы было ў большай ступені поспехам або правалам?» 51% апытаных выбраў другі варыянт, выказаўшы цвёрдую незадаволенасць. Пры гэтым сярод тых, хто палічыў палітыку 44-га амерыканскага прэзідэнта правалам, 92% склалі кансерватыўныя рэспубліканцы. У той жа час незадаволенасць працай Кангрэса выказваюць 77% апытаных амерыканцаў.

Украінцы шукаюць статус бежанцаў у асноўным у Расіі

Польскае кіраўніцтва па справах замежнікаў паведаміла, што фармальны статус бежанца ў гэтай краіне шукаюць сёння 1,1 тысячы грамадзян Украіны. Для параўнання, на статус бежанца ў Расіі прэтэндуе каля 120 тысяч грамадзян Украіны, а на тэрыторыі дзяржаў Еўрасаюза такіх налічваецца разам 4 тысячы. Польскае кіраўніцтва сцвярджае пры гэтым, што ніводзін з просьбітаў з Украіны да гэтага часу не атрымаў статусу эмігранта.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Сямейныя сваркі прыводзяць да затрымкі развіцця ў дзяцей

Паводле звестак, атрыманых у выніку даследавання англійскіх навукоўцаў, сямейныя праблемы, з якімі чалавек сутыкаецца ў дзяцінстве ці ў раннім юнацтве, здольныя аказаць негатыўны ўплыў на развіццё яго мозга, а гэта можа прывесці, у сваю чаргу, да праблем з псіхікай у будучыні.

У сваёй працы навукоўцы з Універсітэта Усходняй Англіі сканавалі галаўны мозг падлеткаў ва ўзросце 17—19 гадоў. Высветлілася, што тыя з паддоследных, хто перажыў лёгкія або сярэднія сямейныя сваркі да 11 гадоў, мелі меншы мазжачок. Гэтая вобласць мозга, у ліку іншага, звязана з рэгуляваннем стрэсу. Спецыялісты ўпэўнены, што паменшаны мазжачок можа з'яўляцца своеасаблівым індыкатарам рызыкі псіхічных захворванняў і іншых будучых сур'ёзных адхіленняў у развіцці.

КОРАТКА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, згодна з якім карэкціруюцца палажэнні агульнавоінскіх статутаў Узброеных Сіл.

Прафіцыт знешняга гандлю таварамі і паслугамі Беларусі ў студзені—ліпені 2014 года склаў $456,9 млн.

Гранічная максімальная рознічная цана на аўтамабільны бензін маркі AI-92-K5-Еўра будзе ўстаноўлена ў памеры, эквівалентным 1 долару ЗША за 1 літр. Потым кошт гэтага віду бензіну будзе індэксавацца ў залежнасці ад змянення курсу беларускага рубля адносна долара. Перагляд цэн на астатнія віды нафтапрадуктаў будзе ажыццяўляцца пры захаванні існуючых цэнавых суадносін паміж бензінам AI-92-K5-Еўра і іншымі маркамі паліва.

Беларускія барцы вольнага стылю Уладзіслаў Андрэеў (вагавая катэгорыя да 57 кг) і Алі Шабанаў (70 кг) сталі ўладальнікамі бронзавых узнагарод на чэмпіянаце свету-2014 па спартыўнай барацьбе, што стартаваў у Ташкенце.

■ Жывіце ў бяспецы

ХАЛАДЫ БЕЗ ТРАГЕДЫІ

Прычынай пажару можа стаць і трэшчына на коміне, і пакінутая «зарадка» ад тэлефона

Пачатак ацяпляльнага сезона ў Беларусі не за гарамі. І ўжо цяпер паўстае пытанне: як не толькі правільна падрыхтаваць сваё жытло да халоднага перыяду, але і правесці гэты час без бяды? Расказаць пра гэта карэспандэнт «Звязды» папрасіў начальніка аддзела арганізацыі прафілактычнай работы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Руслана ЛІХАМАНАВА.

ПРАВЕРЦЕ ПЕЧ ЦЯПЕР

«У прыватным доме, як правіла, асноўная крыніца цяпла — гэта печ. І ўжо цяпер, на пачатку восені, трэба праводзіць яе тэхнічнае абслугоўванне. Праверце, ці няма на ёй расколін, ці шчыльна зачыняюцца дзверцы, прачысціце дымаход. Трэба абавязкова пабяліць печ. Гэта робіцца для таго, каб падчас прапальвання высветліліся магчымыя слабыя месцы — напрыклад, незаўважныя вокам шчыліны або выкрышаныя швы.

Побач з топачнай дзверцай на падлозе мусіць быць прыбіты металічны ліст памерам 50 на 75 сантыметраў.

СТАР. 3

■ Актуальна

СТАЎКІ АРЭНДНАГА ДЗЯРЖЖЫЛЛЯ БУДУЦЬ НАПАЛОВУ ТАННЕЙШЫЯ ЗА РЫНАЧНЫЯ

Аб гэтым учора паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль КАЛІНІН на адкрыцці 22-й міжнароднай спецыялізаванай выставы «Будпрагрэс-2014».

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Віцэ-прэм'ер праінфармаваў, што, у адпаведнасці з даручэннямі кіраўніка дзяржавы, урад на працягу тыдня вызначыць цэнавы дыяпазон ставак, умовы і крытэрыі для атрымання арэнднага жылля. Анатоль Калінін адзначыў, што цана карыстання дзяржаўным арэндным жыллём будзе ніжэйшай, чым на рынку. Аднак такое жыллё ўсё роўна павінна акупляцца. Ва ўсім свеце стаўкі такой арэнды вызначаюцца шляхам дзялення агульных затрат на будаўніцтва на перыяд акупнасці (звычайна гэта 20 гадоў). Наша краіна ў межах сацыяльнай абароны насельніцтва выкарыстоўвае іншы алгарытм: улічваецца магчымасць насельніцтва і цэннікі на існуючым рынку прыватнага жылля. Вырашана прытрымлівацца тут пэўнага балансу. Спадар Калінін лічыць, што цана будзе ў межах 50% ад рыначнай.

Нагадаем, што «Будпрагрэс» з'яўляецца самай буйнай будаўнічай выставай у Беларусі, арганізатарам якой выступае кампанія «Мінскэкспа» пры падтрымцы Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва. Сёлета яе ўдзельнікамі сталі больш за 350 вядучых будаўнічых кампаній з Беларусі, Расіі, Германіі, Італіі, Літвы, Малдовы, Польшчы і іншых краін.

Сяргей КУРКАЧ.

СУПРАЦОЎНІЦТВА ПАШЫРЫЦЦА

Учора Аляксандр Гур'янаў, намеснік міністра замежных спраў Беларусі, сустрэўся з міжведамаснай дэлегацыяй Злучаных Штатаў Амерыкі. Апошняя складалася з прадстаўнікоў кіраўніцтва Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці, міністэрства абароны і Дзяржаўнага дэпартамента Злучаных Штатаў.

Як паведамляе прэс-служба Міністэрства замежных спраў, бакі абмеркавалі магчымасці аднаўлення і пашырэння ўзаемадзеяння паміж Беларуссю і Злучанымі Штатамі ў пэўных галінах, абмяняліся поглядамі на бягучы стан і перспектывы развіцця двухбаковых адносін. Падчас сустрэчы былі закрануты і тыя пытанні, па якіх сёння паміж бакамі існуюць рознагалоссі. Прадстаўнікі нашай краіны і ЗША выказалі па іх свае прынцыповыя пазіцыі, а таксама дамовіліся аб працягу дыялогу для забеспячэння нармалізацыі беларуска-амерыканскіх стасункаў.

Праграмай візіту міжведамаснай дэлегацыі ЗША запланаваны таксама сустрэчы ў Міністэрстве абароны, Міністэрстве эканомікі і Міністэрстве адукацыі Беларусі.

У апошнія гады стасункі з гэтай краінай, пасля дастаткова «халоднага» перыяду, паступова наладжваюцца. Кіраўніцтва Злучаных Штатаў разумее, што палітыка санкцый прыносіць шкоду і іх дзяржаве, у сваю чаргу і наша краіна імкнецца знайсці падыходы да супрацоўніцтва з заходнімі краінамі. Так, паміж Мінскам і Вашынгтонам вядуцца інтэнсіўныя закрытыя кансультацыі аб аднаўленні паўнавартаснай работы пасольстваў (з 2008 года дыпламатычныя прадстаўніцтвы не выдаюць віз). Акрамя таго, ЗША знялі санкцыі ў дачыненні да двух нашых прадпрыемстваў — «Белтэхэкспарту» і «БелОМА». Беларусь жа з 2013 года пашырыла сваё супрацоўніцтва з ЗША ў рамках Паўночнай размеркавальнай сеткі, па якой ажыццяўляецца забеспячэнне кантынгенту НАТА ў Афганістане (праз нашу краіну ідзе чыгуначны транзіт).

Значную ролю ў змякчэнні адносін можа адыграць і факт інвестыцыйнай прывабнасці нашай краіны для амерыканскіх інвестараў. Нягледзячы на стрыманыя палітычныя адносіны, бізнесмены ЗША часта выбіраюць менавіта Беларусь у якасці краіны, куды можна ўкласці свой капітал. Так, ужо ў 2010 годзе ў рэспубліцы было зарэгістравана больш за 300 сумесных і замежных прадпрыемстваў з удзелам капіталу грамадзян Злучаных Штатаў.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

■ На думку парламентарыя

Ігар БУЗОЎСКІ:

«ЗАКОНАПРАЕКТ — ЯК «БОЛЕВЫ НЕРВ»

Быць правадніком ідэй моладзі ў парламенце — такая магчымасць ёсць у Ігара БУЗОЎСКАГА, члена Савета Рэспублікі і першага сакратара Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Парламентарый упэўнены: амаль любы законапраект, які абмяркоўваецца ў яго камісіі — па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці — мае прамое дачыненне да жыцця маладых людзей. Пра тое, якія фільмы і кнігі дапамагаюць сфарміравацца чалавеку як асобе, што абавязкова трэба зрабіць у маладыя гады і якога ўдасканалення патрабуе сённяшняя сістэма адукацыі, пра шляхі барацьбы з карупцыяй і ці трэба імкнуцца моладзі ў сталіцу Ігар Бузоўскі расказаў карэспандэнту «Звязды».

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Вы ўзначальваеце найбуйнейшую маладзёжную арганізацыю краіны і з'яўляецеся адным з самых маладых членаў Савета Рэспублікі. Што пакладзена ў аснову вашага прафесійнага і асобаснага росту?

— Наколькі дасягненні вялікія, складана сказаць. Заўсёды ёсць магчымасць параўнаць. Тым не менш тыя пасады, якія я займаю, азначаюць для мяне, у першую чаргу, вялікі давер і з боку дэпутатаў, якія выбралі мяне ў якасці члена Савета Рэспублікі, і з боку моладзі, якая прызначыла мяне першым сакратаром цэнтральнага камітэта БРСМ. Што да росту прафесійнага і асобаснага, то ў аснову гэтага пакладзена выхаванне бацькоў, якія прывілі мне пачуццё адказнасці за тую справу, якую табе даверылі.

Наконт імкнення пераехаць у сталіцу скажу: калі гэтая скіраванасць дазваляе ісці далей у прафесійным плане і ты бачыш, што самарэалізуешся там, то, натуральна, трэба імкнуцца ў вялікі горад.

— Вашы сённяшнія мэты як члена Савета Рэспублікі?

— Як вы заўважылі, сёння я адзін з самых маладых членаў Савета Рэспублікі. У сувязі з гэтым мае мэты як парламентарыя ўвязваюцца з праблемамі моладзі і той працай у маладзёжнай арганізацыі, якой я зараз займаюся. Моладзь мае магчымасць праз мяне як праз правадніка ўплываць на рашэнні, якія прымаюцца падчас абмеркавання заканадаўства нашай краіны. Гэта вялікі давер і вялікая адказнасць. Таму мэта, якую я стаўлю перад сабой — каб меркаванне моладзі, яе праблемы і памкненні, сусветныя тэндэнцыі ў маладзёжным развіцці — каб усё гэта ўплывала на заканадаўчыя рашэнні, якія прымаюцца ў розных сферах.

— На працягу месяца ішло абмеркаванне закона аб барацьбе з карупцыяй, і некаторыя людзі выказалі думку, што «антыкарупцыйная прышчэпка» павінна «рабіцца» яшчэ ў юнацтве. Якія захады, акрамя пагрозы крымінальнага пакарання, маглі б адыграць ролю такой «прышчэпкі»?

— Для сябе я вычленіў тры падыходы, якія дазволілі б вырашыць гэту праблему. Першы падыход — пакаранне. У прынцыпе, сёння ў большай ступені ён і выкарыстоўваецца: штрафы, зняволенне. Гэта, безумоўна, правільная моц. «Трэйдынг — гэта рамяство, а не мастацтва для абраных або высокая навука. Паспяховы трэйдар — гэта спакойны чалавек, які ставіцца да трэйдынгу, як да працы. Ці да падпрацоўкі. Гэта не хобі і не спорт: чым менш хваляванняў, тым лепш. Чалавек павінен валодаць вытрымкай і здаровым сэнсам. Таму пачаткоўцам парада адна — не спяшацца і не нервавацца. Спачатку тэорыя, потым практыка на дэма-рахунку і толькі затым гандаль на рэальныя грошы. І, безумоўна, трэба заўсёды трымаць пад кантролем свае эмоцыі. Эмацыянальныя ўчынкі — самыя неабдуманыя і, як вынік, самыя стратныя. Таму людзям эмацыянальным праца на фінансавых рынках супрацьпаказаная, лепш нават не пачынаць. Так што спакой і яшчэ раз спакой». Дарэчы, няма розніцы, якога вы полу. Абсалютная большасць трэйдараў — мужчыны. Але калі асобна параўнаць статыстыку мужчын і жанчын, то высветліцца, што трэйдараў, якія стабільна гандлююць з прыбыткам, сярод жанчын значна больш.

БЕЛАРУСЬ МОЖА АКАЗАЦЦА Ў ПЛЮСЕ?

Паводле ацэнак аналітыкаў «Альпары», палітычная і эканамічная сітуацыя, якая склалася на міжнароднай арэне, дае Беларусі дадатковыя магчымасці. У выніку ўзаемных санкцый паміж Захадам і Расіяй беларускія прамыслоўцы атрымалі магчымасць рэзка пашырыць сваю прысутнасць на расійскім рынку, цесна інтэгравацца ў тэхналагічныя ланцужкі расійскага ваенна-прамысловага комплексу. Дадатковую выручку Беларусь можа прыцягнуць і за кошт паставак у Расію сельскагаспадарчай прадукцыі.

«У якасці пазітыўнай тэндэнцыі можам адзначыць таксама рост даверу насельніцтва Беларусі да нацыянальнай валюты. Нягледзячы на зніжэнне ставак, на працягу трох кварталаў 2014 года фіксуецца прыток тэрміновых рублёвых дэпазітаў. Больш за тое, у ліпені ўпершыню з пачатку года на ўнутраным рынку продаж валюты перавысіў куплю. Добрая дынаміка назіраецца і ў знешнім гандлі — шмат у чым дзякуючы таму, што апераджальнымі тэмпамі зніжаецца імпарт. На валютным рынку Нацыянальны банк на працягу некалькіх месяцаў мы канстатуем умацаванне нацыянальнай валюты. На думку аналітыкаў «Альпары», да канца бягучага года рэжым курсаўтварэння захаваецца, і кошт долара ЗША да канца года не перавысіць 10 900 беларускіх рублёў».

ШТО ВАРТА РЭГУЛЯВАЦЬ?

«Мы лічым, што неабходна ўвесці базавыя тэрміны і паняцці, распрацаваць і ўкараніць стандарты і правілы дзейнасці ўдзельнікаў рынку, а таксама кантроль за іх выкананнем, — заявіў Аляксандр Сабодзін. — У рамках асацыяцыі распрацоўваецца этыка паводзінаў кампаній на рынку. Галоўная мэта — зрабіць рынак празрыстым, абараніць і забяспечыць інтарэсы кліентаў, дзяржавы і форэкс-кампаній. Мяркуем, што стварэнне ў Беларусі спецыяльнага заканадаўства для форэкс-кампаній выведзе рынак на новы ўзровень. Многае, вядома, залежыць ад таго, якую канфігурацыю прыме сістэма рэгулявання рынку «Форэкс» і як гэта рэгуляванне будзе рэалізоўвацца на практыцы. Гэта значыць, ці будзе забяспечаны баланс паміж абаронай правоў спажыўцоў паслуг форэкс-кампаній і бізнес-умовамі».

Трэйдынг — гэта рамяство, а не мастацтва для абраных або высокая навука.

Праект указа, які зараз праходзіць працэдуру ўзгаднення, у прыватнасці, прадугледжвае стварэнне Нацыянальнага клірынгавага цэнтра, адной з задач якога з'яўляецца зніжэнне рызык і дадатковая абарона правоў спажыўцоў. Ён будзе ўяўляць сабой спецыяльнае гаспадарчае таварыства, у статутным фондзе якога больш за 50% акцый знаходзіцца ва ўласнасці дзяржавы. Цэнтр будзе ствараць гарантыйны фонд за кошт узносаў юрыдычных асоб, якія ажыццяўляюць дзейнасць на пазабіржавым рынку «Форэкс». Таксама Нацыянальны клірынгавы цэнтр прадаставіць форэкс-кампаніям праграмнае забеспячэнне, неабходнае для ажыццяўлення дзейнасці і падачы справаздачнасці. Спецыялісты цэнтра будуць займацца зборам, сістэматызацыяй і ўлікам інфармацыі аб усіх аперацыях форэкс-кампаній, а таксама фіксаваць парушэнні. Яшчэ адным напрамкам работы цэнтра будзе рэгулярная ацэнка фінансавай устойлівасці форэкс-кампаній.

Дарэчы, праектам указа прадугледжана, што да 1 студзеня 2018 года фізічныя асобы будуць вызвалены ад падаходнага падатку з прыбытку ад валютных аперацый з удзелам беларускіх форэкс-кампаній. «Лічым, што гэта зробіць узаемадзеянне з беларускімі форэкс-кампаніямі эканамічна больш выгадным, чым з замежнымі. Часовыя падаткоўвыя паслабленні прапануюцца і для саміх кампаній: да 1 студзеня 2018 года стаўку падатку на прыбытак плануецца знізіць на 50%. Пры гэтым форэкс-кампаніяй у Беларусі будзе лічыцца юрыдычная асоба са статутным фондам не менш за 10 тысяч базавых велічынь, занесеная ў рэестр».

ЯК НЕ ТРАПІЦЬ НА МАХЛЯРОЎ?

Вядома, трэба глядзець, якія канкрэтна паслугі прапануе кампанія і як яна гэта робіць. «Насцярожыць павінна, у прыватнасці, абяцанне патэнцыйным кліентам незвычайна высокай ці гарантаванай прыбытковасці, а таксама абяцанне нярыначных істотных бонусаў за прыцягненне кліентаў, — папярэджвае спецыяліст. — Падставай для хвалявання з'яўляецца таксама адсутнасць аб'ектыўных гарантый вяртання сродкаў, перададзеных кліентам і/або атрыманых кліентам ад учыненых аперацый. Павышаную асцярожнасць трэба праявіць і пры лжывым пазіцыянаванні кампаніі. У такім выпадку крыніцай фарміравання даходу можа дэкларавацца давернае кіраванне сродкамі кліентаў самой кампаніяй. Пры гэтым інфармацыя аб наяўнасці ў кампаніі адпаведнай ліцэнзіі, прадугледжанай беларускім заканадаўствам, альбо наогул не паказваецца, альбо паказваецца інфармацыя аб ліцэнзіі іншай асобы. Да лжывага пазіцыянавання таксама можна аднесці аперыраванне паняццямі «ўклад» і «дэпазіт», якія адносяцца да банкаўскай дзейнасці».

Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■ На слыху

ПРЫЧЫНА АВАРЫІ — НАРКОТЫКІ?

Раніцай 9 верасня ў Гродне кіроўца аўтамабіля «Сеат Ібіца» не справіўся з кіраваннем, выехаў на прыпынак грамадскага транспарту і збіў дзвюх жанчын, якія чакалі транспарт.

Адна з жанчын ад атрыманых траўмаў памерла на месцы, другая з цялеснымі пашкоджаннямі дастаўлена ў бальніцу. Яе жыццё знаходзіцца па-за небяспекай. Сам вінаўнік ДТЗ не атрымаў бачных цялесных пашкоджанняў.

Упраўленне Следчага камітэта Беларусі па Гродзенскай вобласці завяло крымінальную справу па факце ДТЗ. Паколькі кіроўца знаходзіўся ў стане наркатычнага ап'янення, ён шпіталізаваны ў бальніцу і ўтрымліваецца пад канвоем. Установлена, што затрыманы, якому ў кастрычніку споўніцца 19 гадоў, раней не прыцягваўся да крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці. Ён не працуе і не вучыцца, ухіляецца ад прызыву на службу ў войска.

■ Уласныя фінансы

Я Ў ТРЭЙДАРЫ Б ПАЙШОЎ,

або Эмацыянальным людзям на фінансавым рынку няма чаго рабіць

Рынак «Форэкс» (FOReign EXchange) з'явіўся ў канцы 1970-х гадоў, пасля таго як многія краіны вырашылі не прывязваць кошт сваёй нацыянальнай валюты да цаны долара ці золата. Гэта сфарміравала міжнародны рынак, на якім валюты маглі абменьвацца па свабодных курсах. Трэйдары, якія працуюць на рынку «Форэкс», імкнуцца вызначыць, куды пойдзе кошт той ці іншай валюты, і здзейсніць здзелку на куплю або на продаж. Свае рашэнні трэйдары прымаюць на аснове аналізу ўсіх фактараў, што дазваляе ім вызначаць кірунак руху коштаў больш дакладна. Пры гэтым зарабіць на «Форэксе» можна як на падзенні цаны валюты, так і на яе росце.

Неўзабаве гандаль на рынку «Форэкс» у нашай краіне выйдзе на новы ўзровень. Рыхтуецца заканадаўчы акт, які сфарміруе выразныя правілы працы на рынку, дадаткова абароніць інтарэсы ўдзельнікаў і створыць эканамічныя стымулы для росту беларускага сегменту гэтага міжнароднага бізнесу. Пра ўсе асаблівасці валютнага рынку расказаў падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА **Аляксандр САБОДЗІН, першы старшыня Асацыяцыі развіцця фінансавага рынку (АРФІН), дырэктар офіса афіцыйнага партнёра кампаніі «Альпары» ў Мінску**.

ДЗЕ НЕСТАБІЛЬНА, ТАМ І ВЫГАДНА



«Для нашых суайчыннікаў, якія жадаюць захаваць і прымножыць свае сродкі, даступны цэлы шэраг фінансавых інструментаў. Аднак адразу варта падзяліць мэты. Захаваць — значыць зберагчы сродкі ад іх абясцэньвання (у ідэале — і ад інфляцыі, і ад дэвальвацыі), атрымліваючы параўнальна невялікі, часта гарантаваны прыбытак з нізкай рызыкай страты сродкаў. Прымножыць — атрымаць даход істотна вышэйшы, чым працэнты па банкаўскім дэпазіце, але без гарантый яго атрымання і захавання першапачатковай сумы», — патлумачыў спецыяліст. Найбольш папулярныя з інструментаў сёння валютныя і рублёвыя дэпазіты, а таксама валютныя дзяржаўныя аблігацыі. Фондавы рынак мала развіты. Таму рынак «Форэкс» — нядрэнная альтэрнатыва. «Традыцыйна ён асацыюецца з гандлем сусветнымі валютамі, аднак цяпер вядучыя міжнародныя форэкс-брокеры даюць магчымасць гандляваць і акцыямі, нафтай, золатам, таварнымі ф'ючарсамі, інвеставаць у гандаль паспяховых трэйдараў, набываць структураваныя прадукты з гарантыяй захавання першапачатковай сумы інвестыцый», — сцвярджае Аляксандр Сабодзін.

Самым распаўсюджаным інструментам, які прапануюць форэкс-брокеры, з'яўляецца класічны трэйдынг — гандаль валютнымі парамі на рынку «Форэкс». Долары мяняюцца на еўра, фунты на ены, шведскія кроны на тайскія баты і гэтак далей у мноства спалучэнняў. «Найбольшы прыбытак прыносяць тыя пары, дзе ў гэты момант максімальная валатыльнасць — гэта значыць велічыня змены курсу, — падказвае эксперт. — Калі курс абсалютна стабільны, шмат на гэтым не заробіш. Калі ваганні істотныя, то значны і прыбытак. Дапусцім, фунт у адносінах да ены за тыдзень падаражэў на 3%, потым за тыдзень жа патанеў на 4%, затым зноў падаражэў ужо на 5,5% — на такіх ваганнях можна вельмі нядрэнна зарабляць. Пры гэтым трэба разумець, што валатыльнасць — велічыня няўстойлівая. Сёння найбольшыя ваганні ў адной валютнай пары, праз пару месяцаў у другой, яшчэ праз квартал у трэцяй. Усё пераменліва. На пачатак верасня 2014 года найбольш папулярнымі з усіх валютных пар у кліентаў «Альпары» ў Беларусі сталі EUR/USD (еўра/долар) — больш за 50% здзелак, GBP/USD (брытанскі фунт/долар ЗША) — больш за 21,2%, USD/JPY (долар ЗША/японская ена) — больш за 4%».

На думку аналітыкаў «Альпары», кошт долара ЗША да канца года не перавысіць 10 900 беларускіх рублёў.

ШТО ТРЭБА, КАБ ПАЧАЦЬ

У прынцыпе, вы проста ўключаеце камп'ютар, потым запускаеце спецыяльную праграму (гандлёвы тэрмінал) і праз інтэрнэт далучаецеся да таргоў. Аддаяце ў праграме распараджэнне прадаць або купіць тую ці іншую колькасць валюты — гэта значыць адкрываеце здзелку. Калі курс мяняецца, вы аддаяце загад здзейсніць зваротную аперацыю — такім чынам, здзелка закрываецца. «Розніца будзе вашым прыбыткам. Або стратай. Гледзячы куды пайшоў курс», — нагадвае Аляксандр Сабодзін.

Для трэйдынгу не патрэбна нейкая неверагодная інтэлектуальная моц. «Трэйдынг — гэта рамяство, а не мастацтва для абраных або высокая навука. Паспяховы трэйдар — гэта спакойны чалавек, які ставіцца да трэйдынгу, як да працы. Ці да падпрацоўкі. Гэта не хобі і не спорт: чым менш хваляванняў, тым лепш. Чалавек павінен валодаць вытрымкай і здаровым сэнсам. Таму пачаткоўцам парада адна — не спяшацца і не нервавацца. Спачатку тэорыя, потым практыка на дэма-рахунку і толькі затым гандаль на рэальныя грошы. І, безумоўна, трэба заўсёды трымаць пад кантролем свае эмоцыі. Эмацыянальныя ўчынкі — самыя неабдуманыя і, як вынік, самыя стратныя. Таму людзям эмацыянальным праца на фінансавых рынках супрацьпаказаная, лепш нават не пачынаць. Так што спакой і яшчэ раз спакой». Дарэчы, няма розніцы, якога вы полу. Абсалютная большасць трэйдараў — мужчыны. Але калі асобна параўнаць статыстыку мужчын і жанчын, то высветліцца, што трэйдараў, якія стабільна гандлююць з прыбыткам, сярод жанчын значна больш.

БЕЛАРУСЬ МОЖА АКАЗАЦЦА Ў ПЛЮСЕ?

Паводле ацэнак аналітыкаў «Альпары», палітычная і эканамічная сітуацыя, якая склалася на міжнароднай арэне, дае Беларусі дадатковыя магчымасці. У выніку ўзаемных санкцый паміж Захадам і Расіяй беларускія прамыслоўцы атрымалі магчымасць рэзка пашырыць сваю прысутнасць на расійскім рынку, цесна інтэгравацца ў тэхналагічныя ланцужкі расійскага ваенна-прамысловага комплексу. Дадатковую выручку Беларусь можа прыцягнуць і за кошт паставак у Расію сельскагаспадарчай прадукцыі.

«У якасці пазітыўнай тэндэнцыі можам адзначыць таксама рост даверу насельніцтва Беларусі да нацыянальнай валюты. Нягледзячы на зніжэнне ставак, на працягу трох кварталаў 2014 года фіксуецца прыток тэрміновых рублёвых дэпазітаў. Больш за тое, у ліпені ўпершыню з пачатку года на ўнутраным рынку продаж валюты перавысіў куплю. Добрая дынаміка назіраецца і ў знешнім гандлі — шмат у чым дзякуючы таму, што апераджальнымі тэмпамі зніжаецца імпарт. На валютным рынку Нацыянальны банк на працягу некалькіх месяцаў мы канстатуем умацаванне нацыянальнай валюты. На думку аналітыкаў «Альпары», да канца бягучага года рэжым курсаўтварэння захаваецца, і кошт долара ЗША да канца года не перавысіць 10 900 беларускіх рублёў».

ШТО ВАРТА РЭГУЛЯВАЦЬ?

«Мы лічым, што неабходна ўвесці базавыя тэрміны і паняцці, распрацаваць і ўкараніць стандарты і правілы дзейнасці ўдзельнікаў рынку, а таксама кантроль за іх выкананнем, — заявіў Аляксандр Сабодзін. — У рамках асацыяцыі распрацоўваецца этыка паводзінаў кампаній на рынку. Галоўная мэта — зрабіць рынак празрыстым, абараніць і забяспечыць інтарэсы кліентаў, дзяржавы і форэкс-кампаній. Мяркуем, што стварэнне ў Беларусі спецыяльнага заканадаўства для форэкс-кампаній выведзе рынак на новы ўзровень. Многае, вядома, залежыць ад таго, якую канфігурацыю прыме сістэма рэгулявання рынку «Форэкс» і як гэта рэгуляванне будзе рэалізоўвацца на практыцы. Гэта значыць, ці будзе забяспечаны баланс паміж абаронай правоў спажыўцоў паслуг форэкс-кампаній і бізнес-умовамі».

Трэйдынг — гэта рамяство, а не мастацтва для абраных або высокая навука.

Праект указа, які зараз праходзіць працэдуру ўзгаднення, у прыватнасці, прадугледжвае стварэнне Нацыянальнага клірынгавага цэнтра, адной з задач якога з'яўляецца зніжэнне рызык і дадатковая абарона правоў спажыўцоў. Ён будзе ўяўляць сабой спецыяльнае гаспадарчае таварыства, у статутным фондзе якога больш за 50% акцый знаходзіцца ва ўласнасці дзяржавы. Цэнтр будзе ствараць гарантыйны фонд за кошт узносаў юрыдычных асоб, якія ажыццяўляюць дзейнасць на пазабіржавым рынку «Форэкс». Таксама Нацыянальны клірынгавы цэнтр прадаставіць форэкс-кампаніям праграмнае забеспячэнне, неабходнае для ажыццяўлення дзейнасці і падачы справаздачнасці. Спецыялісты цэнтра будуць займацца зборам, сістэматызацыяй і ўлікам інфармацыі аб усіх аперацыях форэкс-кампаній, а таксама фіксаваць парушэнні. Яшчэ адным напрамкам работы цэнтра будзе рэгулярная ацэнка фінансавай устойлівасці форэкс-кампаній.

Дарэчы, праектам указа прадугледжана, што да 1 студзеня 2018 года фізічныя асобы будуць вызвалены ад падаходнага падатку з прыбытку ад валютных аперацый з удзелам беларускіх форэкс-кампаній. «Лічым, што гэта зробіць узаемадзеянне з беларускімі форэкс-кампаніямі эканамічна больш выгадным, чым з замежнымі. Часовыя падаткоўвыя паслабленні прапануюцца і для саміх кампаній: да 1 студзеня 2018 года стаўку падатку на прыбытак плануецца знізіць на 50%. Пры гэтым форэкс-кампаніяй у Беларусі будзе лічыцца юрыдычная асоба са статутным фондам не менш за 10 тысяч базавых велічынь, занесеная ў рэестр».

ЯК НЕ ТРАПІЦЬ НА МАХЛЯРОЎ?

Вядома, трэба глядзець, якія канкрэтна паслугі прапануе кампанія і як яна гэта робіць. «Насцярожыць павінна, у прыватнасці, абяцанне патэнцыйным кліентам незвычайна высокай ці гарантаванай прыбытковасці, а таксама абяцанне нярыначных істотных бонусаў за прыцягненне кліентаў, — папярэджвае спецыяліст. — Падставай для хвалявання з'яўляецца таксама адсутнасць аб'ектыўных гарантый вяртання сродкаў, перададзеных кліентам і/або атрыманых кліентам ад учыненых аперацый. Павышаную асцярожнасць трэба праявіць і пры лжывым пазіцыянаванні кампаніі. У такім выпадку крыніцай фарміравання даходу можа дэкларавацца давернае кіраванне сродкамі кліентаў самой кампаніяй. Пры гэтым інфармацыя аб наяўнасці ў кампаніі адпаведнай ліцэнзіі, прадугледжанай беларускім заканадаўствам, альбо наогул не паказваецца, альбо паказваецца інфармацыя аб ліцэнзіі іншай асобы. Да лжывага пазіцыянавання таксама можна аднесці аперыраванне паняццямі «ўклад» і «дэпазіт», якія адносяцца да банкаўскай дзейнасці».

Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■ Справы жыццёвыя

ХТО АДКАЖА ЗА БАНКЕТ?

Як карэспандэнт «Звязды» ледзь не засталася без кавярні на ўласным вяселлі

Надумаўшы ўзяць шлюб, першае, што мы з жанiхом зрабілі пасля займання чаргі ў ЗАГСе, — гэта знайшлі кавярню для правядзення вясельнага банкета. Не люблю адкладаць важныя справы на апошні момант: лепш вырашыць пытанне загадзя, чым не вырашыць яго ўвогуле ды яшчэ і атрымаць праблемы. Але, як давялося пераканацца на ўласным вопыце, нават перастрахоўка не гарантуе іх адсутнасці.

РАНА ЎЗРАДАВАЛІСЯ

Пошукі пачалі ледзь не за год да ўрачыстасці, а за 9 месяцаў да яе ўжо вызначыліся. Адзін са сталічных рэстаранаў-бістро, які з гонарам заяўляе пра наяўнасць страў «сапраўднай беларускай кухні», адпавядаў усім нашым пажаданням: прыгожыя інтэр'еры, прымальныя цэны, зручнае размяшчэнне. Ветлівая адміністратар паказала нам залу, узяла нумары нашых тэлефонаў і сказала ні пра што не турбавацца і прыходзіць за два тыдні да вяселля, каб скласці меню.

«А як жа перадаплата? Можа быць, варта заключыць дагавор?» — здзівіліся мы, бо разлічвалі пакінуць грашовы задатак, каб замацаваць бронь. «Мы дзяржаўная ўстанова і не маем права браць з людзей грошы, не аказаўшы ім паслуг, — патлумачылі нам і запэўнілі: — Будзьце спакойныя, ваша месца ўжо ніхто не зойме».

Мы расслабіліся: адна з самых важных спраў вырашаная. І пачалі «змагацца» на іншых вясельных «франтах». А галаўнога болю ў маладых нямала: знайсці вядучага, падабраць строі, набыць пярсцёнкі, узгадніць праграму, зрабіць запрашэнні, прадумаць афармленне інтэр'ера...

Менавіта для таго, каб абмеркаваць дэталі афармлення банкетнай залы, за месяц да даты вяселля я вырашыла наведаць кавярню. І тут здарылася тое, пра што я нават падумаць не магла. Спачатку адміністратар (якую я дагэтуль не бачыла) сказала, што ў кавярні няма залы, разлічанай на 75 чалавек. «Як жа няма, калі мы яе бранiравалі?» — пытаюся. «Ёсць на 68, максімум — на 70». — «Вы-датна, — адказваю, — нам яна падыходзіць».

Пагартаўшы нататнік з запісамі, жанчына раптоўна пацікавілася: «Вы Крысціна?» — «Не, я Дзіяна». Пачынаю сумнявацца ці то ў цвярозасці ўласнай свядомасці, ці то ў цвярозасці свядомасці адміністратара. І тут высвятляецца, што ў дзень нашага свята зала, якую мы выбралі, забраніравана... іншымі людзьмі. Зазіраю ў нататнік і бачу: імя і нумар тэлефона майго жаніха запісаны мала таго што алоўкам і з памылкай, дык насупраць яшчэ пазначана і іншая, у два разы меншая зала! Як так атрымалася, мне патлумачыць не змаглі, бо запісвала нас «дзяўчына, якая тут ужо не працуе». А мая суразмоўца рэгістравала людзей пасля таго, як яе папярэдніца звольнілася. Далей сітуацыя становіцца яшчэ больш камічнай (хаця тады яна ўспрымалася як абсурдная): адміністратарка тэлефануе людзям, якія забраніравалі нашу залу; замест таго, каб усё патлумачыць, прынесці прабачэнні і прапанаваць у якасці кампенсацыі нейкае рашэнне, яна пытаецца, ці ўсё ў іх застаецца ў сіле і... прапануе пад'ехаць скласці меню. А мне адказвае: «Ну не можам жа мы адмовіць людзям толькі з-за таго, што атрымалася накладка!» Выдатнае абыходжанне з кліентамі! На якой падставе адмаўляюць нам, якія знайшлі гэтае месца нашмат раней? Толькі з прычыны непрафесіяналізму персаналу ў арганізацыі? Тады адказнасць за сваіх служачых павінна несці сама арганізацыя, і гэта ніякім чынам не павінен быць галаўным болем заказчыкаў!

«І што нам цяпер рабіць, калі да вяселля застаўся месяц, усе месцы на сезон ужо занятыя, праграма спланавана з улікам банкета, а запрашэнні з адрасам кавярні ўжо разасланы гасцям, у тым ліку іншагароднім?» — пытаюся, яшчэ не верачы, што нашы планы зруйнаваныя ўшчэнт. «Не ведаю, — абыякава адказвае адміністратар. — Магу толькі па-філасофску пераканаць вас у тым, што ўсё, што робіцца, — да лепшага...»

Намеснік дырэктара скрушна ківаў галавой: маўляў, у нас такое ўпершыню, і мы будзем сачыць, каб больш падобных сітуацый не паўтарылася.

Праўда, апроч філасофствання, мне прапанавалі на выбар дзве іншыя залы: адну ў той жа кавярні, другую — у суседняй. Аднак абодва варыянты мяне не задаволілі, ды і ўсялякае жаданне адзначаць свята нараджэння нашай сям'і ў гэтай установе пасля інцыдэнту знікла...

ДАЙЦЕ КНІГУ СКАРГАЎ!

Вырашыўшы не пакідаць справу на самацёк, наступны раз мы з жанiхом прыехалі ў кавярню, каб паразмаўляць з дырэктарам. Кіравала намі жаданне атрымаць хоць нейкія разумныя тлумачэнні, а таксама зрабіць што-небудзь для таго, каб падобных выпадкаў больш не здарылася. Прыехаўшы на месца ў час прыёму грамадзян (як было пазначана на сайце), мы звярнуліся да ахоўніка. Магутнага выгляду малады чалавек спачатку прапанаваў нам паразмаўляць з адміністратарам, пасля па рацыі запытаўся ў некага, ці на месцы дырэктар. Далей, нічога не тлумачачы, папрасіў пачакаць. Нарэшце, набегаўшыся з залы ў залу, ахоўнік прамовіў: дырэктара на месцы няма, яе кудысьці адвезлі, а машына вярнулася сюды. (Цікава, чаму дырэктар дзесьці раз'язджае ў час прыёму грамадзян?)

Ісці мы не збіраліся, таму спачатку да нас выйшла ўжо знаёмая мне адміністратарка, якая не магла ўцяміць: чаму ж нам не падышлі іншыя залы, якія яна прапанавала? Пасля да нас усё ж выйшаў намеснік дырэктара і патлумачыў, што дырэктар зараз з намі размаўляць не можа, бо ў яе на прыёме чалавек. Аднак! Дык дзе ж усё-такі знаходзілася таямнічая кіраўніца?.. Зрэшты, убачыць яе нам так і не давялося.

Слухаючы нашу версію падзей, намеснік дырэктара скрушна ківаў галавой: маўляў, у нас такое ўпершыню, і мы будзем сачыць, каб больш падобных сітуацый не паўтарылася. «Гэтага мы і хочам!» — узрадаваліся мы і... прапанавалі занесці свае заўвагі і пажаданні ў кнігу скаргаў і прапаноў. Бо на словах паабяцаць можна што заўгодна і забыцца пра гэта, а напісанае, як той казаў, застаецца. А часам і мае плён, бо на запісы ў кнігах скаргаў павінны адказваць, да таго ж іх правяраюць. «Калі вы і напішаце, то мы не адкажам вам нічога новага, — спрабаваў пазбегнуць пісьмовага звароту намеснік дырэктара. — Тое ж самае, што кажу вам зараз». Аднак мы настойвалі, і доўга супраціўляцца прадстаўнік адміністрацыі не мог: даволі хутка кнігу нам прынеслі. Разгарнуўшы яе, адзначыла, што апошні запіс быў зроблены літаральна ўчора. Мы ўнеслі свае прапановы: падбіраць кампетэнтны персанал, рэгулярна праводзіць з ім інструктаж, заключаць дагаворы з кліентамі... Мы ж не са скаргамі і абвінавачваннямі. Мы — з канкрэтыкай і па-добраму.

«А дырэктар — на месцы...» — немаведама для чаго паўтарыў на развітанне наш суразмоўца і пабег па сваіх справах. Нам жа засталося чакаць адказу...

Зрэшты, ён прыйшоў у адпаведны тэрмін, і ў ім, апроч выказвання спачуванняў, паведамлялася, што нашы прапановы прыняты да ўвагі.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■ Шляхам веры і духоўнасці

Мой родны трэці кут

З чарговай вандроўкі па славутых і малавядомых мясцінах вярнулася міжнародная навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў» з Дабрадатным агнём ад Гроба Гасподняга. Сёння «Звязда» пачынае знаёміць чытачоў з фотазамалёўкамі свайго сталага прадстаўніка ў экспедыцыі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

З вышыні арбіты касмічнага спадарожніка Зямлі вёска Вялікая Сваротва Баранавіцкага раёна здаецца зусім невялічкай. Сярод зялёных шапак дрэў, квадрацікаў дахаў выразна праступае абнесены плотам трохкутны будынак — месца, на якое цікава паглядзець і з космасу, і з зямлі.

Гэты фотаздымак я адшукаў у інтэрнэтаўскай калекцыі незвычайных культавых пабудоў. Трохкутная царква Святой Троіцы ў Вялікай Сваротве лічыцца ў Еўропе ўнікальнай.

У 1747 годзе «скарбавы» пісар Мікалай Аўсяны пабудаваў трохкутную царкву на дзіва ўсім месцічам. Невядома, чым ён кіраваўся, выбіраючы такую некананічную форму храма.

Але калі зазірнуць у далёкае мінулае, то там прататыпам хрысціянскай царквы можна ўбачыць скінію (з грэчаскай мовы — будан, шацёр). Не выключана, што культавыя шатры нашых далёкіх продкаў былі трохкутнымі. Як не выключана і тое, што ў васямнаццатым стагоддзі землякі з Вялікай Сваротвы ўзвялі будынак-трохкутнік дзеля згоды трох мясцовых канфесій. Маўляў, уваходзьце з трох розных бакоў, але збірайцеся да аднаго алтара! Вельмі актуальны падыход і ў наш час. А можа, форма царквы заклікана паўтарыць ідэю Святой Троіцы?

У будынка гэтай царквы, названай у гонар Святой Троіцы, — багатая гісторыя. У недалёкім мінулым яго знешні выгляд выклікаў хутчэй спачуванне, чым захапленне. Сёння на знешняй сцяне царквы ўсталявана памятная дошка, дзе засведчана: «Адноўлена «Электрабуд Заходняй Сібіры» (г. Ніжнявартаўск, Расія), па ініцыятыве а. Георгія (Сапуна) пры фінансавай падтрымцы Раісы Мельнік (Мінск), Валерыя Жука (Баранавічы), Андрэя Копача (Баранавічы)». Цяпер адноўлены храм ахоўваецца дзяржавай.

Бачыцца, што царква Святой Троіцы мае перспектыву не толькі як цэнтр духоўнага і рэлігійнага выхавання. Вакол яе некалі распасціралася прыгожая сядзіба і парк, якія належалі роду Незабытоўскіх. Недалёка — маляўнічая тэраса ракі Сваротвы, адзінай, што бярэ пачатак у светлых водах возера Свіцязь. У нашы дні пра былую раскошу сядзібы нагадваюць толькі мурыды алея старых дубоў... Але хіба ж не ўпрыгожаць гэтыя гістарычныя мясціны маршруты турыстаў? Усё тут чакае такога ж аднаўлення, як храм.

Аднаўленне ў жыццядайнай згодзе. Падобнай да той, якая, па адной з версій, некалі дала жыццё ўнікальнаму трохкутнаму будынку ў маленькай вёсцы Вялікая Сваротва.

Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.

Баранавіцкі раён

На здымках: *так выглядае царква на здымку з космасу; адпаведна трохкутнай форме, дах над жырандоляй увенчаны не традыцыйным круглым купалам, а трохкутным праёмам; строгую форму храма падкрэслівае ўнікальная каменная кладка сцен; адзін з трох куткоў храма ўпрыгожвае іканастас.*

■ Інфарм-укол

МАМА, НЕ КУРЫ!

Негатыўны ўплыў курэння можа праявіцца ўжо на этапе зачацця — яно зніжае верагоднасць паспяховага апладнення ў жанчын, якія плануюць цяжарнасць. Тытунь перашкаджае выпрацоўцы прагестэрону, які рыхтуе матку да прыняцця аплодненай яйцаклеткі. А калі ў арганізме жанчын недастаткова прагестэрону, зародак не замацуецца. Нікацінавае атручэнне адбіваецца таксама на якасці і колькасці спермы. Праўда, курэнне не варта залічваць у спосабы папярэджвання цяжарнасці. Такім парам удаецца зацяжарыць, аднак яны часам і не ўяўляюць, як шкодзяць будучаму дзіцяці сваёй залежнасцю.

Паводле слоў **загадчыцы лабараторыі 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Алы РАДЗЮК**, вельмі важна развітацца з нікацінам на раннім тэрміне цяжарнасці, калі плод пачынае актыўна расці, і рэгулярнае паступленне нікаціну будзе правакаваць страту вагі і затрымку развіцця.

Вучоныя ўжо дакладна ўстанавілі, што ў жанчын-курцоў...

...вышэйшая рызыка развіцця пазаматачнай цяжарнасці (у 4 разы);

...часцей развіваецца ранні таксікоз, варыкоз, галавакружэнні, запоры і гестоз;

...зніжаецца імунітэт, што не на карысць і плоду, і самой жанчыне;

...назіраецца дэфіцыт вітаміну С, што ў сваю чаргу, зноў жа, зніжае імунітэт, перашкаджае засваенню бялкоў, парушае абмен рэчываў, выклікае дэпрэсію і санлівасць;

...надыходзіць кісланароднае галаданне, што спрыяе вірусным, бактэрыяльным, бранхіяльным, лёгачным захворванням у будучага дзіцяці;

...пагаршаецца выпрацоўка гармонаў, што можа выклікаць ранні разрыў плоднага пузыра і з'яўленне на свет неданошанага дзіцяці;

...немаўляты пакутуюць ад «нікацінавага голаду» — часта плачуць, дрэнна спяць, нават сінеюць і задыхаюцца;

...вышэйшая рызыка ўзнікнення сіндрому раптоўнай дзіцячай смерці;

...дзеці пасля часцей і раней за равеснікаў пачынаюць курыць.

З пасіўным курэннем (а такім можна назваць нават курэнне бацькоў на балконе, лесвічнай пляцоўцы, паколькі мікрачасцінкі дыму застаюцца на адзенні, усіх навакольных прадметах) спецыялісты звязваюць развіццё ў дзяцей алергіі, бранхіяльнай астмы, інфекцыі унутранага вуха, пнеўманіі, бранхіту, цяжкіх прастуд, лейкеміі.

Святлана БАРЫСЕНКА

Халады без трагедыі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэтая мера перасцярогі патрэбна для таго, каб пажар не пачаўся ад вугольчыка, які можа выпадкова выпасці. Не распальвайце агонь з дапамогай лёгкаўзгаральных вадкасцяў і не кладзіце ў топку дровы, з-за даўжыні якіх дзверцы не могуць зачыніцца. Паліце ў печы самі, не дазваляйце рабіць гэта дзецям. За дзве гадзіны да таго, як пакінуць хату або легчы спаць, спыняйце паленне. І ні ў якім разе не дапускайце магчымасці перагравання печы. Яно можа адбыцца не толькі тады, калі топка будзе працягвацца гадзінамі без перапынку, але і калі печ працуе не на тым відзе паліва, для якога яна прызначана.

А парушэнне гэтых няхітрых правіл можа каштаваць вельмі дорага. Сёлета ў студзені ратаўнікоў выклікалі жыхары вёскі Вербеж Чэрыкаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Гарэў прыватны дом. Яшчэ да прыбыцця спецыялістаў сусядзі дапамаглі выйсці на вуліцу кабеце і яе мужу. Прычынай пажару стала трэшчына на коміне печы. На шчасце, тут абышлося без загінулых. Аднак агулам жа толькі з-за няправільнай эксплуатацыі пячнога абсталявання сёлета ў краіне адбылося 676 пажараў. За памылкі заплацілі жыццём 29 чалавек...»

ПАДВОДНЫ КАМЕНЬ «РЭЖЫМУ ЧАКАННЯ»

«Сезонная прычына, па якой узнікаюць пажары ў халодны час году, — гэта парушэнне правіл карыстання электрапрыборамі. Светлавы дзень робіцца зусім маленькім, адпаведна, электрычныя сеткі эксплуатуюцца больш інтэнсіўна. Дадайце да гэтага карыстанне абагравальнікамі, якія энергазберагальнымі назваць не выпадае. І аднойчы сетка акажацца перагружанай. Да таго ж трэба карыстацца толькі тым абагравальнікам, які выраблены прамысловым спосабам, сертыфікаваны на тэрыторыі Беларусі і мае інструкцыю па эксплуатацыі. Калі ж тэрмін службы абагравальніка скончыўся — лепш аднясіце яго на смеццяпункт і набудзьце новы. З гэтым прыборам жартаваць нельга. Бо наступствы могуць быць і самымі цяжкімі...

На пачатак верасня ў краіне адбылося 4505 пажараў, у якіх загінулі 420 чалавек.

Напрыканцы студзеня ў адным з інтэрнатаў у Мінску адкрытым полымем гарэў пакой на чацвёртым паверсе. Гаспадыня паспела выйсці з пекла яшчэ да таго, як на месца падзей прыехалі ратаўнікі, якія эвакуявалі дваццаць чалавек. На шчасце, пажар ніводнага жыцця не забраў. Усё скончылася пашкоджанай маёмасцю і закураным калідорам чацвёртага паверха. Як пасля высветлілася, пакой загарэўся з-за кароткага замыкання. Адначасова працавала шмат электрапрыбораў, у тым ліку і абагравальнік. І сетка не вытрымала...

Амаль ва ўсіх сучасных электрапрыборах ёсць функцыя рэжыму чакання. На першы погляд, гэта даволі зручна — не трэба кожны раз падключаць той жа тэлевізар, мікрахвалевую печ або музычны цэнтр. Пакідаюць людзі ў разетках і зарадныя прылады ад мабільных тэлефонаў. Матыў гэтага ўчынку просты — навошта кожны раз шукаць прыладу, якая лёгка губляецца? Аднак калі вы выходзіце з хаты, дзе ў такім рэжыме працуюць электрапрыборы, то вы аўтаматычна пакідаеце іх без назірання. І аднойчы гэта можа скончыцца бядой.

Так, у інтэрнаце прадпрыемства «Магілёўхімвалакно» загарэўся пакой. Ратаўнікі прыбылі на месца аператыўна, полымя вялікай бяды нарабіць не паспела. Прычынай пажару стаў пакінуты ў рэжыме чакання тэлевізар...»

ЗБЕРАЖЫ СЯБЕ САМ

«Каб наша праца была больш эфектыўнай, да яе падключаюцца ў тым ліку ў залежнасці ад абставін органы мясцовай выканаўчай улады, унутраных спраў і адукацыі. Акцэнт мы робім на тых грамадзянах, якія адносяцца да групы рызыкі. Гэта адзінокія людзі, якія часта з-за стану здароўя або недахопу фінансаў не могуць самастойна адрамантаваць печ або электраправодку; шматдзетныя сем'і і асобы, якія злоўжываюць спіртнымі напоямі.

У Беларусі рэалізуюцца тры дзяржаўныя праграмы, скіраваныя на рэсурснае забеспячэнне супрацьпажарных мерапрыемстваў па рамонце печаў і электраправодкі, а таксама ўсталяванне аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў з магчымасцю выводу сігналу на фасад будынка. І гэтае тэхнічнае рашэнне можна назваць вельмі эфектыўным. Прыгадваецца выпадак, які адбыўся ў Брэсцкай вобласці. Загарэўся прыватны дом, у якім быў аўтаномны пажарны апавяшчальнік. Там знаходзіліся п'яны бацька і малое дзіця. Сігнал апавяшчальніка быў выведзены на фасад будынка. Адлік часу ішоў на секунды. Усё магло б скончыцца трагічна, але на дапамогу паспеў прыйсці сусед, які пачуў сігнал трывогі. Ён выбіў шыбу і паспеў выцягнуць адтуль людзей».

Агульнарэспубліканскую акцыю па папярэджанні пажараў і гібелі ад іх людзей у жыллёвым фондзе падчас асенне-зімовага пажаранебяспечнага перыяду ратаўнікі будуць праводзіць на працягу ўсяго кастрычніка. А далучыцца да яе можа кожны чалавек. Дастаткова толькі мець або ўсталяваць у сваім жытле аўтаномны пажарны апавяшчальнік. Каштуе апарат не так і дорага: каля ста тысяч рублёў. Аднак толькі за сем месяцаў сёлета гэтыя прыборы ўратавалі 57 чалавечых жыццяў...

Валяр'ян ШКЛЕННІК

■ Творчасць юных

ПАД ВЕТРАЗЕМ МАРЫ

У краіне з 8 па 16 верасня ладзіцца тыдзень дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Да гэтай падзеі карпатліва рыхтуюцца і на Міншчыне. Цэнтры творчасці прапануюць усім ахвотным кірмашы, выставы метадычнай літаратуры і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, экскурсіі, прэзентацыі, творчыя лабараторыі, тэатралізаваныя паказы, канцэртныя, забаўляльныя і фізкультурна-спартыўныя праграмы.

Навінкай Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна стане правядзенне акцыі «Новае жыццё старых рэчаў». Педагогі і навучэнцы пакажуць, як з другаснай сыравіны і непатрэбных рэчаў, іншага можна зрабіць нешта карыснае. Цікавай чакаецца і акцыя «Увага, пошук!» Падчас яе юныя парламенцёры будуць шукаць мэтанакіраваных, энергічных, крэатыўных маладых людзей, якія імкнуцца вучыцца, ісці наперад і зрабіць свой горад і жыццё моладзі лепшымі. А для навучэнцаў 6-7 класаў прапануецца злёт у форме гульні па станцыях «На турысцкай сцяжыне», фестываль тэхнічнай творчасці «І будзе майстэрства за працу ўзнагародай».

У Старадарожскім цэнтры дзіцячай творчасці «Святліца» імя Стасевіча пройдзе дзень адчыненых дзвярэй. Мяркуецца, што цэнтр наведаюць каля 200 навучэнцаў установ адукацыі горада і раёна. Госці змогуць папрацаваць у творчых майстэрнях «Вясёлыя вырабы», «Лепка з гліны», «Мяккая цацка», «Малюнак па шкле», «Мастацкая праца». А на цэнтральнай плошчы горада адбудзецца рэкламная акцыя «Запрашаем ў свет творчасці».

У Маладзечанскім цэнтры творчасці дзяцей і моладзі арганізуецца акцыя «Алё, мы шукаем таленты!» пры падтрымцы кампаніі «Мабільныя тэлесістэмы». Удзельнікі бізнес-кампаніі «Поспех» будуць прадаваць вырабы і сувеніры асабістай вытворчасці. У гарадскім парку можна паглядзець паказальныя выступленні судамадэлістаў «Пад ветразем мары». А для педагогаў установ адукацыі правядуць майстар-класы па валенні, скрапбукінгу, рабоце са скурай.

Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Барысава запрашае на дзень адчыненых дзвярэй у дзіцячых пакоях па месцы жыхарства «А ў нас у двары», а таксама на творчую сустрэчу з мастачкай Вольгай Галаўко, таварыскую сустрэчу па міні-футболе ФК «Гарызонт-ЦТДіМ» з камандай сярэдняй школы № 18.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Віншуем шаноўную каляжанку Таццяну Іванаўну АНДРЫЕВІЧ з юбілеем!

Зычым здароўя, спакою, дабрабыту, радасцяў жыцця, сямейнага ладу.

Няхай "звяздоўская" пошта прыносіць вам толькі добрыя словы!

Звяздоўцы.

Ёсць мясціны, дзе толькі марыш пабываць, разглядаючы каляровую карту свету. Ёсць экзотыка, якую цікава аднойчы ўбачыць на ўласныя вочы, пакаштаваць на смак і колер. Ёсць больш ці менш папулярныя курорты, танныя ці не вельмі, модныя ці крыху падзабытыя, куды, пры пэўным старанні, сёння можа паехаць адпачыць практычна кожны. А ёсць месцы, куды хочацца вяртацца зноў і зноў, бо там застаецца жыць часцінка твайго сэрца.

Нам пашанцавала, што такія месцы ёсць і ў Беларусі. Адна з турыстычных жамчужын нашай краіны — Прыпяцкае Палессе: гэта Эльдарада для паляўнічых і рыбаловаў, найбагацейшая глеба для працы эколагаў, археолагаў, этнографаў і іншых навукоўцаў і безліч уражанняў для адпачывальнікаў. У кожную сустрэчу Прыпяць — беларуская Амазонка — нібыта зусім новая, і ў той жа час нязменна чароўная і прывабная. А палешукі — руплівыя, гасцінныя і ветлівыя гаспадары тутэйшых мясцін — робяць усё, каб захаваць гэту прыгажосць, і з такой любоўю расказваюць і паказваюць сваю зямлю, што проста немагчыма ў яе не закахацца...

Таму не дзіўна, што менавіта тут, у Нацыянальным парку «Прыпяцкі», зарадзілася і выспела ідэя правядзення фестывалю этнакультурных традыцый «Покліч Палесся». Сёлета 13 верасня фэст пройдзе на Гомельшчыне ўжо трэці раз — і ўпершыню ў высокім статусе міжнароднага. Пра тое, якім будзе гэта грандыёзнае свята, што змянілася ў Нацыянальным парку за гэтыя гады і якія перспектывы для развіцця турызму бачаць перад сабой палешукі, «Звязда» даведалася, што называецца, з першых вуснаў.

Фестываль этнакультурных традыцый — свята народных талентаў.

ПАЛЕССЕ СКЛІКАЕ

СУЧАСНАЯ ГІСТОРЫЯ

Першы фестываль «Покліч Палесся» адбыўся ў адміністрацыйным цэнтры Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» — аграгарадку Ляскавічы — у 2010 годзе і сабраў больш як 5,5 тысячы гасцей і ўдзельнікаў з 11 рэгіёнаў Гомельшчыны і Брэстчыны. Наступны фэст, які прайшоў у 2012 годзе, наведалі ўжо звыш 10 тысяч чалавек. Асноўнымі арганізатарамі фестывалю выступаюць Гомельскі і Брэсцкі аблвыканкамы, Міністэрства культуры, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрства інфармацыі Беларусі, дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова «Нацыянальны парк «Прыпяцкі». Знайшло маштабнае культурнае мерапрыемства і падтрымку ў спонсараў — ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод», ААТ «Белаграпрамбанк» і шэрагу іншых.

Генеральны дырэктар Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» Сцяпан БАМБІЗА.

— Нават самы першы фестываль засведчыў, што падобныя мерапрыемствы патрэбны, — разважае **генеральны дырэктар Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» Сцяпан БАМБІЗА.** — Дзе яшчэ можна не проста пазнаёміцца, а павучыцца традыцыйным рамёствам, даведацца іх сакрэты ад саміх майстроў; не толькі паслухаць выступленні прафесійных артыстаў, а пачуць аўтэнтычныя нашы песні, шмат дзе незаслужана забытыя, якія беражліва захоўваюць самадзейныя артысты ў глыбінцы, у сельскіх дамах культуры? Вось у гэтым рэчышчы хацелася б рухацца і далей, не губляючы тую асаблівую атмасферу шчырасці, захоўваючы адметны фармат «Поклічу Палесся», на якім галоўнымі героямі мусяць быць не нейкія заезджыя «зоркі», а самі палешукі.

Хачу адзначыць: калі б не было ў нас падтрымкі на самым высокім узроўні, рэалізаваць гэту ідэю і тым больш правесці фестываль трэці раз і вырасці з вясковага свята да міжнароднага ўзроўню нізавошта не ўдалося б. Хоць шмат было сумненняў, ці патрэбен нам яшчэ адзін фестываль, калі штогод праходзіць мноства маштабных культурных мерапрыемстваў у іншых гарадах Беларусі; але на мінулым фэсце, у 2012-м, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што менавіта «Покліч Палесся» адраджае нашу самабытнасць і нясе асаблівую душэўнасць,таму фестывалю — быць. Ды наогул, толькі дзякуючы любові нашага Прэзідэнта да палешукоў, да гэтага працавітага краю, у свой час была прынята праграма комплекснага развіцця і адраджэння Прыпяцкага Палесся!

...Прайдзіцеся па падворках, зазірніце ў твары гэтых людзей: жанчыны ў святочных строях, твары нібы свецяцца знутры, вочы зззяюць — якія яны ўсе прыгожыя, пявучыя, поўныя спрадвечнага, нейкага сапраўднага жыцця, якое часцінкай застаецца ў кожным з нас «ад каранёў», у які б мегаполіс ты ні з'ехаў... Каб гэтыя «карані» не высахлі, а заставаліся напоўненымі жыццядайнай сілай, трэба насамрэч зусім мала: уважлівае і паважлівае стаўленне да традыцый, да ўласнай гісторыі і культуры.

СПРАВЫ ФЕСТЫВАЛЬНЫЯ

...Да пачатку 3-га міжнароднага фестывалю этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» застаюцца лічаныя дні, а ў Нацыянальным парку «Прыпяцкі» ўжо практычна ўсё гатова для прыёму ўдзельнікаў і гасцей мерапрыемства. Завяршаецца афармленне падворкаў, на якіх дэлегацыя кожнага з раёнаў (Ельскага, Жыткавіцкага, Калінкавіцкага, Лельчыцкага, Лунінецкага, Мазырскага, Нараўлянскага, Петрыкаўскага, Пінскага, Столінскага, Хойніцкага) прадэманструе сваю праграму — традыцыйныя рамёствы палешукоў, стравы нацыянальнай кухні, аўтэнтычныя спевы і танцы. Наносяць апошнія мазкі і рыскі на свае работы 10 гомельскіх і брэсцкіх мастакоў, якія цягам некалькіх тыдняў натхняліся прыпяцкімі краявідамі падчас першага пленэру «Зямля пад белымі крыламі» — 13 верасня на адмысловай пляцоўцы можна будзе паглядзець, якім убачылі творцы твар Палесся. І нават флагманы мясцовага флоту, белыя з блакітам цеплаходы «Зубр», «Лось» і «Кірыл Тураўскі», гатовыя ў любы момант павезці сваіх пасажыраў на прагулку па велічнай і загадкавай Прыпяці, здаецца, стоячы ля прычала, у нецярпенні перашэптваюцца з рачнымі хвалямі і прыбярэжным чаротам: «Чакаем, чакаем...».

Гэтае нецярплівае прадчуванне цалкам зразумелае: праграма сёлетняга фестывалю абяцае быць надзвычай цікавай і насычанай сюрпрызамі, тым больш многія падзеі суправаджаюцца дадаткам «упершыню».

Так, упершыню ў адной з зал Музея прыроды пройдзе фотавыстава «Знакамітыя палешукі», героямі якой сталі некалькі дзясяткаў чалавек, якія зрабілі значны ўнёсак у развіццё Палесся, а таксама бліскуча праявілі сябе ў розных прафесійных сферах, прычым не толькі ў Беларусі. Наогул, толькі дзякуючы любові нашага Прэзідэнта да палешукоў, да гэтага працавітага краю, у свой час была прынята праграма комплекснага развіцця і адраджэння Прыпяцкага Палесся!

Прыгажосць Прыпяцкага Палесся вабіць да сябе ў любы час года, на пленэр сюды часта прыязджаюць мастакі. Гомельскага жывапісца Уладзіміра ЕЎТУХОВА фотааб'ектыў убачыў за працай над пейзажам аграгарадка Ляскавічы.

...Прайдзіцеся па падворках, зазірніце ў твары гэтых людзей: жанчыны ў святочных строях, твары нібы свецяцца знутры, вочы зззяюць — якія яны ўсе прыгожыя, пявучыя, поўныя спрадвечнага, нейкага сапраўднага жыцця, якое часцінкай застаецца ў кожным з нас «ад каранёў», у які б мегаполіс ты ні з'ехаў... Каб гэтыя «карані» не высахлі, а заставаліся напоўненымі жыццядайнай сілай, трэба насамрэч зусім мала: уважлівае і паважлівае стаўленне да традыцый, да ўласнай гісторыі і культуры.

Упершыню Гомельскі аблвыканкам правядзе падчас фестывалю конкурс маладой сям'і «Уладар Палесся» (у ім, на радасць тутэйшых жыхароў, возьме ўдзел і сям'я з мясцовай вёскі Брынёва): маладыя прадэманструюць, хто з іх лацвей упраўляецца з касамі ды сякерамі, а жанкам давядзецца праявіць як гаспадарчыя ўменні, так і кулінарныя, а таксама творчыя, таленты. У першы раз пройдзе і міжнародны конкурс дзявочага хараства прыклад, ці ведалі вы, што першы прэзідэнт Ізраіля Хаім Вейцман — ураджэнец Палесся, выпускнік Пінскай гімназіі? А такіх прыкладаў у гісторыі палешукоў не адзін і не два... Як не адзін і не два творы мастацтва прысвечаны менавіта гэтаму адметнаму краю. Якім убачылі Палессе шматлікія рэжысёры, кожны ахвотны зможа даведацца падчас паказу тэматычных кіна- і відэафільмаў «Вянок Палесся». Таксама ў першы раз адбудзецца прэзентацыя і ўручэнне памятнага знаку-сімвала «Ганаровы паляшук», а яшчэ пройдзе гашэнне адмысловага штэмпеля.

«Палеская прыгажуня-2014».

Упершыню на пляцоўцы пад адкрытым небам пройдзе выстава ручнікоў, на якой госці фэсту змогуць параўнаць узоры і прыёмы вышыўкі, уласцівыя кожнаму палескаму раёну. Тут жа ўсталююць некалькі кроснаў, за якімі майстрыхі дадуць кожнаму ахвотнаму майстар-клас па ткацтве.

...Яшчэ напярэдадні асноўнага свята адбылася этнаграфічная экспедыцыя па Прыпяцкім Палессі «Летнік на Петрыкаўшчыне», удзельнікі якога — маладыя навукоўцы, практыкуючыя фальклярысты, студэнты вядучых ВНУ — наведалі тры населеныя пункты Петрыкаўскага раёна, дзе захаваліся традыцыйныя народныя абрады і гульні, занатавалі ўспаміны і расказы мясцовых жыхароў — носьбітаў фальклору, паўдзельнічалі ў майстар-класах па народнай культуры Прыпяцкага Палесся. Па выніках гэтай маштабнай экспедыцыйнай працы за 2012 і 2014 гг. плануецца выданне адмысловага этнаграфічнага зборніка.

На галоўнай фестывальнай сцэне выступяць як беларускія артысты і калектывы (заслужаная артыстка Беларусі Ірына Дарафеева, спявачка Вольга Гарнічар, салісты Гомельскага абласнога прадзюсарскага цэнтра, аматарскі ансамбль танца «Дружба», аматарскі калектыў вакальна-харэаграфічны ансамбль «Гомій», фальклорны гурт «Млын сонца»), так і госці: расійскі калектыў «Данскія казакі», ансамбль рускай песні «Бабчыны ўнукі», ансамбль песні і танца народаў Поўначы «Чукотка», украінскі народны ансамбль «Чып», артысты і творчыя калектывы з Малдовы і Польшчы. Увечары канцэрт зменіць маладзёжная танцавальна-забаўляльная праграма, а завершыцца песенна-танцавальны марафон святочным феерверкам і лазерным шоу.

Ляскавічы. Вячэрні прычал.

І ВЫСОКАЕ, І ЗЯМНОЕ

...Тым жа, хто аддае перавагу не шумнаму і шматлюднаму святу, а адпачынку на ўлонні прыроды, варта завітаць у іншае месца — на прыстань ля гасцініцы «Над Прыпяццю». Адсюль можна будзе адправіцца на прагулку на лодках або пракаціцца па рацэ на цеплаходзе. Або ўздоўж Прыпяці — на конях. Або — гэта для зусім адчайных аматараў вострых адчуванняў — узняцца над святам і паглядзець у сінія вочы магутнай ракі з вышыні палёту на паветраным шары. Падобная забава, дарэчы, сёлета таксама будзе арганізавана ўпершыню. Ну, а калі вы прыбудзеце на свята сям'ёй, то дзяцей, безумоўна, парадуе гульнявая пляцоўка з анімататарамі, конкурсамі, атракцыёнамі, арэлямі, электрамабілямі і іншымі мілымі дзіцячаму сэрцу заняткамі.

Знойдзецца месца і ежы духоўнай — для паэтаў і пісьменнікаў арганізуюць творчую майстэрню «Літаратурнае Палессе» (у яе межах пройдзе прэзентацыя кнігі-пераможцы конкурсу Гомельскага аблвыканкама — літаратурнай прэміі імя Кірыла Тураўскага «Вядзьмарка Палеская» В. Куліка) — і звычайнай, зямной: ужо чакае наведнікаў «рэстаран пад адкрытым небам» (пляцоўка літаральна на вадзе, дзе будуць карміць удзельнікаў фестывалю), таксама абсталявана мноства гандлёвых пунктаў для рэалізацыі харчовых і нехарчовых тавараў, сувеніраў, вырабаў народных умельцаў.

«На вялізным шэрагу тэматычных падворкаў «Палеская слабада», які размесціцца ўздоўж Прыпяці, кожны раён прадстаўляе падворак, што адлюстроўвае этнаграфічную самабытнасць народнай культуры мікрарэгіёна, ладзіць майстар-класы па рамёствах. Свае работы пакажуць найлепшыя ў раёнах ганчары, рыбакі, паляўнічыя, кавалі, майстры па вырабе лодак і чаўноў, ткачы, бортнікі, бондары, майстры па пляценні з лазы і з саломы, вышывальшчыцы і вязальшчыцы на прутках і кручком, — пералічвае **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалогіі Вольга ПРЫХОДЗЬКА.** — Нацыянальны парк «Прыпяцкі» тэрытарыяльна належыць да чатырох розных раёнаў — Петрыкаўскага, Жыткавіцкага, Калінкавіцкага і Лельчыцкага — і адначасова з'яўляецца самастойнай адладжанай структурай, таму і на фестывалі па традыцыі арганізуем уласны падворак».

Капітан цеплахода «Лань» Андрэй БЫКОЎСКІ выдатна ведае ўсе блакітныя дарогі Нацыянальнага парку «Прыпяцкі».

На водных шляхах Прыпяцкага Палесся.

А паміж падворкамі ўпершыню ўзвялі асобную канцэртную пляцоўку — тут у межах фестывальнай праграмы аўтэнтычных калектываў «Палескія гульні» выступяць выканаўцы розных жанраў палескага фальклору — і пакажуць шырокай публіцы фрагменты старажытных летніх і восеньскіх каляндарна-абрадавых і сямейна-бытавых свят з выкананнем тых самых песень, танцаў, народных гульняў, інструментальных твораў, а таксама вусных узораў народнай прозы, якія таленавітыя палешукі захавалі ад продкаў і перадалі наступнаму пакаленню.

Дарэчы, сёлета паміж раёнамі — удзельнікамі фестывалю не будзе спаборніцтва: плануецца ацэньваць падворкі па розных намінацыях і адзначыць узнагародамі і памятнымі прызамі абсалютна кожнага з удзельнікаў. Бо каго ні вазьмі з прадстаўленых творчых калектываў, майстроў і рамеснікаў — у пэўным сэнсе каштоўнасць, бо захоўвае для нашчадкаў частку ўнікальнай этнакультурнай спадчыны Палесся.

Я ПАВЯДУ

Выканаўца абавязкаў загадчыцы Музея прыроды Вольга ПАШУК паказала нам новыя экспанаты — ручнікі, якія мясцовыя майстрыхі ўпрыгожылі вышыванымі палескімі кветкамі.

Абысці і аб'ехаць за адзін раз усю плошчу «Прыпяцкага» — а гэта больш як 200 тысяч гектараў лясоў, палёў і рэк — зразумела ж, немагчыма. Але атрымаць уяўленне пра тое, хто са спрадвечных чатырохногіх, крылатых і падводных насельнікаў Прыпяцкага Палесся жыве па суседстве з чалавекам, можна, нават не пакідаючы тэрыторыю аграгарадка Ляскавічы. Дзеля гэтага варта наведаць Музей прыроды і пазнаёміцца з Прыпяцкім Палессем у мініяцюры — можна самастойна, а лепш у кампаніі экскурсавода (тым больш кошт экскурсіі па сённяшнім часе — чыста сімвалічны, параўнальны з цаной пачка чыпсаў!). У тым ліку і дзякуючы гэтаму фактару музей карыстаецца вялікай папулярнасцю — толькі ў бягучым годзе яго наведалі ўжо каля 20 тысяч чалавек.

Гэты турыстычны аб'ект вельмі малады: памяшканне было ўзведзена ў 2010 годзе, а ўрачыстае адкрыццё Музея прыроды адбылося 25 жніўня 2012 года, на другім фестывалі «Покліч Палесся». Тады, як узгадваюць дзяўчаты-экскурсаводы, быў нечакана вялікі наплыў наведнікаў, і ім давялося прайсці сапраўдную «баявую загартоўку». Затое цяпер, здаецца, іх хоць пасярод ночы разбудзі — правядуць экскурсію з заплюшчанымі вачыма і нідзе не саб'юцца і не запнуцца.

— Музей прыроды нацыянальнага парку складаецца з 6 асноўных зал, дзе размяшчаюцца пастаянныя экспазіцыі, і адной, у якой можна праводзіць кароткатэрміновыя выставы, — расказвае **выканаўца абавязкаў загадчыцы Музея прыроды Вольга Фёдараўна ПАШУК.**

Карысную інфармацыю можна атрымаць ужо пры ўваходзе ў музей — проста ў вестыбюлі месціцца археалагічная даведка па тэрыторыі нацыянальнага парку, паказана Тураўская свідравіна ў разрэзе, Муравінскае міжледавікоўе (яго рэльеф можна ўбачыць падчас рачной прагулкі на параходзе). Таксама з першых крокаў можна ажыццявіць «падарожжа» па рэчышчы Прыпяці і яе асноўных буйных прытокаў (забягаючы наперад, прыадкрыем яшчэ адзін сакрэт: на самым верхнім версе музея, напрыканцы экспазіцыі, кожны ахвотны можа, не сыходзячы з падлогі, яшчэ і «праплыць з варагаў у грэкі», праз Тураў, Смаленск, Чарнігаў і Кіеў, ад Чорнага да Балтыйскага мора...).

Пераходзячы з залы ў залу, наведнікі знаёмяцца найперш з археалагічнымі згадкамі пра Прыпяцкае Палессе. Дарэчы, спецыяльна для Музея прыроды Нацыянальная акадэмія навук Беларусі перадала ў дар частку калекцыі знаходак, зробленых у 1985 годзе экспедыцыяй Валянціны Вяргей падчас раскопак на тэрыторыі парку, у вёсках Снядзін і Мардвін. У зале гісторыі можна даведацца, у склад якіх дзяржаў уваходзіла тэрыторыя нацыянальнага парку, пачынаючы з Тураўскага княства да цяперашняга часу. А далей... далей пачынаецца самае цікавае. Набірайце поўныя грудзі паветра і — паглыбляйцеся ў прыроду Палесся, толькі без рызыкі заблукаць у лесе.

Генеральныя спонсары Міжнароднага фестывалю этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» — ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод», ААТ «Белаграпрамбанк»

ОАО

белагропромбанк традиции будущего

З палубы прагулачнага лайнера можна ўбачыць не толькі прыбярэжныя запаведныя лясы, але і іх насельнікаў.

СЯБРОЎ КАРАГОД

РУХ

ХТО НА НОВЕНЬКАГА?

Самы малады з турыстычных аб'ектаў Нацыянальнага парку — гасцініца «Тураў+». Яна адкрылася толькі сёлета ў красавіку, але камфорт і ўтульнасць яе нумароў і кухню мясцовай кавярні паспелі ацаніць ужо больш за 500 гасцей.

«Сярод нашых пастаяльцаў даволі шмат камандзіраваных работнікаў, у тым ліку расіян, — распавядае **намеснік дырэктара гасцініцы Валянціна КАЗКО,** — якіх прывабліваюць і невысокія цэны, і размяшчэнне гатэля — тут даволі ціхае, спакойнае месца, разам з тым зручнае ў сэнсе транспартнага злучэння: недалёка і да Турава, і да Жыткавіч. Але мы, безумоўна, зацікаўленыя і ў тым, каб прыцягваць больш турыстаў, якія жадаюць наведаць старажытны Тураў, прайсці экалагічнымі сцежкамі або з'ездзіць на рачную прагулку ці ў сафары-тур у Нацыянальны парк «Прыпяцкі». Бо гэта зусім іншая катэгорыя гасцей: яны прыязджаюць менавіта адпачываць, і акрамя пражывання, цікавяцца дадатковымі паслугамі — пракатам веласіпедаў, мангалаў, экскурсійным абслугоўваннем».

Пасля рэканструкцыі былое адміністрацыйнае памяшканне не пазнаць ні звонку, ні знутры: замест працоўных кабінетаў і падсобных памяшканняў — 20 разнастайных нумароў на 36 ложка-месцаў: 8 двухмесных, 4 аднамесныя, 4 люксы і 4 паўлюксы.

Пасля рэканструкцыі былое адміністрацыйнае памяшканне не пазнаць ні звонку, ні знутры: замест працоўных кабінетаў і падсобных памяшканняў — 20 разнастайных нумароў на 36 ложка-месцаў: 8 двухмесных, 4 аднамесныя, 4 люксы і 4 паўлюксы. У кожным, незалежна ад катэгорыі нумара, ёсць усё неабходнае для пражывання: мяккая мэбля для адпачынку, новая сантэхніка, халадзільнік, тэлевізар. Кошты дэмакратычныя: ад 200 тысяч за ложка-месца да 620 — за люксавы нумар. На першым паверсе для гасцей працуюць кавярня, сувенірная крама і асобны музей прыроды з багатай экспазіцыяй — многія турысты адхіляюцца ад асноўных маршрутаў у Тураве і прыязджаюць спецыяльна, каб наведаць яго. Налета музей плануюць таксама абнавіць.

«Гэта самы першы музей Нацыянальнага парку «Прыпяцкі», ён пачаў сваю работу задоўга да цяперашняга вялікага комплексу ў Ляскавічах, — не без гонару за сваю «дзялянку» адзначае **спецыяліст па турызме Таццяна КУРБАКОВА.** — І папулярнасці ён з часам не губляе. Мяркуйце самі: на 1 жніўня толькі наш музей наведалі больш як 3,5 тысячы чалавек, а прыбытак ад экскурсій склаў больш за 40 мільёнаў рублёў. Прыязджаюць і сем'ямі, і кампаніямі — і выходзяць з круглымі вачыма, кажуць, быццам у сапраўдным дзікім лесе пабывалі, толькі што камароў не сустрэлі. Бывае, людзі, якія наведалі раней аналагічную ўстанову ў Белавежскай пушчы, робяць кампліменты нашай экспазіцыі — кажуць, падабаецца больш, бо ўсё зроблена кампактна і натуральна». Натуральна — гэта не моўны абарот, а рэальная акалічнасць: штогод супрацоўнікі ідуць у лес, каб сабраць новы мох для музея. У калекцыі экспанатаў — больш як 120 відаў птушак, а таксама ўсе асноўныя віды млекакормячых, якія жывуць на тэрыторыі нацыянальнага парку: ласі, казулі, алені, нават мядзведзі...

Гасцініца «Тураў+».

Начальнік службы грамадскага харчавання Надзея ПАЧТАВАЛАВА аглядае абедзенную залу перад заездам турыстычнай групы.

«А яшчэ карыстаюцца папулярнасцю ў нашых турыстаў экалагічныя сцежкі, — дадае Таццяна. — Недалёка адсюль ёсць Азаранскае лясніцтва, у якім ужо амаль 20 гадоў як пракладзена сцежка да цар-сасны — паўтара кіламетра па лесе праз забалочаныя ўчасткі, дубровы, саснякі, меліярацыйная сетка XIX стагоддзя, бабровыя паселішчы літаральна ў 1,5 метра ад драўляных масткоў і ўласна сама цар-сасна ўзростам 320 гадоў, высачэзная — 24 метры, з вуллем-калодай і абаронай ад мядзведзяў. Вельмі прыгожыя мясціны і найчысцейшае паветра — не дзіва, што туды ходзяць вялізнымі групамі, бывае, набіраецца некалькі аўтобусаў. Замежнікі туды часта выбіраюцца на арніталагічныя назіранні — сёлета, напрыклад, прыязджалі англічане, бельгійцы, галандцы, якія ведаюць, што менавіта ў гэтым месцы гняздуюць птушкі, якія іх цікавяць. У гэтым жа лясніцтве ёсць экалагічная сцежка да цар-дуба, якому каля 800 гадоў — гэта самае старое дрэва ў нацыянальным парку. І, безумоўна, традыцыйна вялікі попыт на маршруты па старажытных тураўскіх мясцінах — наведванне царквы ў гонар Усіх Святых, збудаванай у 1810 годзе, паломніцтва да каменных крыжоў, якія растуць з зямлі на Барыса-Глебскіх могілках, паход да сярэднявечнай Замкавай гары і помніка Кірылу Тураўскаму».

Так выглядае пакой, разлічаны на два месцы.

БЕЗ ПЕРАПЫНКАЎ

45-годдзе, якое сёлета адзначае Нацыянальны парк «Прыпяцкі» — гэта хоць і не юбілей, але тым не менш пэўная мяжа і нагода падвесці вынікі работы. І вынікі гэтыя, як і асноўныя эканамічныя паказчыкі, адзначае генеральны дырэктар ДПУ «Нацыянальны парк «Прыпяцкі», збольшага станоўчыя: «Мы здолелі давесці да высокага ўзроўню сельскагаспадарчую вытворчасць і вылучылі яе ў асобнае гаспразліковае падраздзяленне, наладзілі годную інфраструктуру для прыёму і размяшчэння гасцей — можна сказаць, з'яўляемся лідарамі ў гэтай сферы; мы заслужылі за гэтыя гады і падтрымліваем добрую рэпутацыю сярод замежных турыстаў... Сёлета «прыраслі» яшчэ на адну гасцініцу — яна адкрылася ў Тураве і ўжо з вясны прымае гасцей. Безумоўна, ёсць куды развівацца і на якія перспектывы працаваць — мы іх бачым і рухаемся ў гэтых кірунках».

Так, з пачатку бягучага года, адзначаюць спецыялісты аддзела турызму, Нацыянальны парк «Прыпяцкі» наведалі ўжо больш як 30 тысяч турыстаў — ды яшчэ асобна на свята Купалля прыехалі каля 5 тысяч гасцей. Для наведнікаў праведзена 403 экскурсіі — калі ўключыць чыстую арыфметыку, выходзіць амаль па 2 экскурсійныя маршруты штодня.

Адкуль едуць госці (а турыстаў тут называюць не «клиентамі» і не «наведнікамі», а менавіта гасцямі. — *Аўт.*)? Найчасцей прыродная і культурная скарбніца Прыпяцкага Палесся вабіць турыстаў з Італіі, Германіі, Францыі, Вялікабрытаніі (адсюль, напрыклад, у маі прыбывае вялікая група навукоўцаў-арнітолагаў), а таксама з Нідэрландаў, Ізраіля. Ацанілі гасціннасць беларусаў і суседзі па СНД — грамадзяне Расіі, Украіны, Казахстана, і, безумоўна, самі суайчыннікі з задавальненнем прыязджаюць у «Прыпяцкі» на невялікія туры выхаднога дня працягласцю ў 1—3 дні. Многія прыбываюць у складзе арганізаваных турыстычных груп — хтосьці выбіраецца на карпаратыўны адпачынак, хтосьці сумяшчае прыемнае з карысным і праводзіць на ўлонні прыроды выязныя семінары, нарады і г.д., часта бываюць на аглядных экскурсіях цэлымі сем'ямі.

Карыстаюцца попытам і разнастайныя экалагічныя сцежкі. Хоць вялікага прыбытку гэты, у большай ступені асветніцкі, напрамак турызму не прыносіць, адмаўляцца ад яго ў «Прыпяцкім» не збіраюцца, бо ўскладваюць на сябе ў тым ліку і адукацыйныя, даследчыцкія, навуковыя задачы.

«Нават у самы напружаны працоўны час мы не забываемся і на прыродаахоўныя мерапрыемствы, — зазначае **галоўны ляснічы Нацыянальнага парку Андрэй БЯСПАЛЫ,** — у пажаранебяспечны перыяд, які быў у жніўні, мы ўзмацнілі кантроль па гэтым пытанні, праводзіліся кругласутачныя дзяжурствы, вылучылі дадатковыя сродкі і стварылі аператыўныя брыгады. Мабыць, таму, што знаходзіліся ў пастаяннай баявой гатоўнасці, надзвычайных здарэнняў і не ўзнікла, тушыць лясныя пажары нам не спатрэбілася. Сумесна з супрацоўнікамі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях мы таксама пільна сочым за ўчасткамі сельгаскарыстання. Асаблівую ўвагу надаём такому моманту, як кантроль жывёльнага свету — у сувязі з небяспекай успышак АЧС у дзікоў. У нацыянальным парку закладзены два жывёльныя могільнікі, праводзяцца знішчальныя мерапрыемствы ў адпаведнасці з даведзенымі планамі. Літаральна штодня пытанне трымаецца на кантролі. І, безумоўна, днямі завяршаем падрыхтоўку да прыёму гасцей міжнароднага фестывалю «Покліч Палесся», прадастаўляем будаўнічы матэрыял кожнаму раёну для абнаўлення падворкаў, абнаўляем машынны парк, дакупляем неабходнае абсталяванне — словам, усе работы вядуцца для таго, каб паказаць у поўнай меры гасціннасць палескага краю».

Каб сачыць за бяспекай у лясной гаспадарцы, гаворыць галоўны ляснічы, трэба не два, а тры вокі: трэцяе на ўсякі выпадак мець на патыліцы. «Бо адказнасць вельмі вялікая: па-першае, Нацыянальны парк — гэта асаблівая прыродаахоўная зона, а па-другое, асабліва пільна трэба кантраляваць раёны, якія трапілі пад забруджванне радыенуклідамі».

Сам Андрэй Аляксандравіч, акрамя кіравання гаспадарчай і прыродаахоўнай дзейнасцю ў лясніцтвах, схільны яшчэ да даследчыцкай працы. Неўзабаве ён збіраецца працягнуць прафесійную адукацыю ў аспірантуры, збірае практычныя матэрыялы для навуковай работы па вытворчай ацэнцы штучных сухадольных дуброў беларускага Палесся. «Прастора для навуковых распрацовак тут проста неабсяжная: трэба вывучаць і гідралогію, і захаванне біяразнастайнасці, і ўплыў змены клімату на змену драўняных парод, што, у сваю чаргу, уплывае на жывёльны свет», — адзначае Андрэй Бяспалы.

***

Наогул, расказваючы пра Прыпяцкае Палессе, можна прысвяціць яму тысячы слоў. Але гэта той самы выпадак, калі лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць ці прачытаць. Дакладней, хоць бы адзін раз — бо (праверана і пацверджана тысячамі турыстаў з розных краін), завітаўшы сюды аднойчы, хочацца вярнуцца зноў. У любую пару года — я не ведаю часу, у які Прыпяць была б непрыгожай. У любой кампаніі ці нават аднаму. У любым настроі — але з адкрытым сэрцам, з любоўю да прыроды і жаданнем убачыць, адчуць асаблівае харство палескай зямлі. Вось і цяпер, калі надвячоркам ці зранку выйсці на бераг задуменнай ракі, удыхнуць на поўныя грудзі свежасць паветра і ўслухацца ў цішыню, можна пачуць няўлоўныя ноткі. Думаеце, гэта робяць развітальны круг над лесам жураўлі? Не, гэта гаворыць само Палессе — кліча ў запаведныя глыбіні і раскрывае свае адвечныя таямніцы...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК, Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіваў Нацыянальнага парку «Прыпяцкі».

УНП 400050258.

ЦЯБЕ Ў МУЗЕЙ...

У супрацоўніцтве са спецыялістамі Мінскага мастацкага камбіната і прыватнымі майстрамі з Магілёва ўдалося стварыць поўнае адчуванне прыпяцкіх краявідаў, пойменных і сухадольных дуброў, балот, затокаў... І, самае галоўнае, — прадстаўнікоў багатага жывёльнага і расліннага свету Палесся. А ў адмысловым макеце дна старыцы (старога рэчышча Прыпяці), бы ў акварыуме, «плывуць» разнастайныя рыбіны, радуючы вока заўзятых рыбакоў.

Заўважаем, што іншыя наведнікі музея міжволі пачынаюць размаўляць цішэй — ілюзія прысутнасці жывых казуль і ланяў, рысі, баброў, дзікоў, якія пільна сочаць за турыстамі з кустоўя, настолькі поўная, што здаецца: толькі неасцярожна паварушыся — і ўся гэта звярыная суполка з тупатам кінецца ўрассыпную.

«Дзеці, напэўна, у захапленні ад гэтай залы, — заўважаю я. — І не толькі дзеці, — дадае Вольга Пашук. — Летась да нас прыязджалі немцы з Франкфурта, у іх там ёсць добры музей прыроды, але сцвярджалі, што наш лепшы».

На наступным паверсе наведнікі як быццам трапляюць у дэкарацыі да гістарычных фільмаў — тут з дакладнасцю да дробязяў прадстаўлены традыцыйныя рамёствы і заняткі палешукоў канца XIX стагоддзя: пчалярства (у тым ліку яго архаічная разнавіднасць, у якой выкарыстоўвалі вуллі лясных пчол — борці, змешчаныя ў дуплах дрэў, і атрымлівалі асабліва духмяны мёд), кавальская справа, рыбацкі промысел, пляценне з лазы, ганчарства (цэнтрам гэтага рамяства на Палессі была вёска Гарадная ў Столінскім раёне: напрыканцы XIX стагоддзя тут пражывалі 300 вопытных ганчароў)... Кросны, млын-вятрак, кавадла — усе гэтыя неад'емныя часткі сялянскага побыту нібыта распавядаюць кожны сваю гісторыю. Яшчэ крыху вышэй можна завітаць «у госці» да палешукоў — на падворак ці ў хату, ацаніць нацыянальныя строі і тыповае ўбранне дома і, магчыма, узгадаць даўнейшыя паездкі да вясковых сваякоў ці сяброў.

Што ні зала — то новыя сустрэчы з прадстаўнікамі багатай фаўны і флоры гэтага ўнікальнага краю.

Пасля апошняга вітка экскурсіі турысты прыходзяць да сувенірнай крамы, дзе найчасцей набываюць падкоўкі на шчасце, вышываныя тканыя ручнікі і стылізаваныя слуцкія паясы, разнастайныя кубкі, інтэр'ерныя карціны і іншыя забаўныя і адначасова прыдатныя для выкарыстання ў паўсядзённым жыцці рэчы. Плюс да гэтага, безумоўна, застаюцца яскравыя ўражанні (колькі хапае аб'ёму памяці ў фотаапаратах) і ўспаміны, каштоўнасць якіх пачынаеш цаніць толькі з часам...

— У бліжэйшай перспектыве, — расказвае генеральны дырэктар Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» Сцяпан Бамбіза, — узвядзенне другой часткі Музея прыроды і побыту — на пляцоўцы пад адкрытым небам. Цяпер распрацоўваецца адпаведны архітэктурны праект, а само будаўніцтва, паводле папярэдніх разлікаў, будзе завершана за 2-3 гады. Ёсць некалькі варыянтаў таго, што хацелася б размясціць у гэтай экспазіцыі, але адназначна будзе паляшуцкі падворак, будуць млыны — вадзяны і вятрак, магчыма, размесцім стылізаваныя пад мястэчка XVII стагоддзя сувенірныя крамы, якія змаглі б рэалізоўваць вырабы нашых рамеснікаў і народных майстроў, яшчэ сёе-тое. Паўтараць ужо існуючыя музеі народнай архітэктуры ў Дудутках, у Строчыцах, безумоўна, не будзем, хочацца знайсці сваю адметнасць, якая і турыстаў зможа прывабіць, і будзе адпавядаць гістарычнай праўдзе.

Малады экскурсавод Яўгенія СТАНЧЫЦ шмат ведае пра жыццё мясцовых птушак і звяроў.

ТУРЫСТУ НА ЗАМЕТКУ

Куды ехаць?

Адміністрацыйны цэнтр ДПУ «Нацыянальны парк «Прыпяцкі»: Беларусь, Гомельская вобласць, Петрыкаўскі раён, аграгарадок Ляскавічы. Усе падрабязнасці будучага адпачынку можна загадзя ўдакладніць у аддзеле турызму: +375 2350 5-70-17 або +375 291250095, а таксама праз зваротную сувязь на афіцыйным сайце www.npp.by.

Што паглядзець?

- аграсядзібу ў Ляскавічах, Музей прыроды;
- шэраг гістарычных аб'ектаў у Тураве, Усіхсвяцкую царкву;
- сафары-парк, экалагічныя сцежкі да цар-дуба і цар-сасны, верхавыя балоты, ландшафты Прыпяці (рачныя экскурсіі), арніталагічныя туры (практычна ў любы час года), а таксама разнастайныя экалагічныя водныя, водна-пешаходныя, веласіпедныя і аўтамабільна-пешаходныя маршруты;
- для аматараў палявання і рыбалкі арганізуюць індывідуальныя і групавыя туры ў вызначаны правіламі час, з дапамогай і суправаджэннем вопытных егераў.

Дзе спыніцца?

- Гасцініца «Над Прыпяццю» 3 зоркі (ёсць рэстаран з асобнай рыбнай залай, канферэнц-зала, басейн, саўна, більярдная, трэнажорная зала і доступ у інтэрнэт),
- гасцініца «Тураў+»,
- катэдж «Сосны»,
- гасцявы домік «Чарацянка»,
- катэдж «Старушки»,
- турыстычны комплекс «Хлупінская буда»,
- турыстычны комплекс «Дарашэвічы».

■ Людзі і лёсы

МЕЛОДЫЯ ДЛЯ БАЯНА

Як хлопец з беларускай глыбінкі заснаваў кафедру ў кансерваторыі і міжнародны фестываль

Пётр Гаварушка — чалавек мінулага стагоддзя і краіны, якая распалася. Дзе і калі яшчэ такое было магчыма? Нарадзіцца 90 гадоў таму ў сялянскай сям'і ў Беларусі сёмым па ліку дзіцем. Закончыць жыццё ў горадзе, які назвалі культурнай сталіцай Расіі, перажыўшы на 6 гадоў краіну, грамадзянінам якой быў тры чвэрці стагоддзя.

Яго малая радзіма — вёска Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. На беразе ціхай рэчкі Добысны раскінуўся маляўнічы парк. У цэнтры яго — старадаўні замак. Пасля рэвалюцыі тут размясцілі сельскагаспадарчы тэхнікум. Вучыцца ў ім — сапраўдная мроя мясцовай моладзі. І Пецю Гаварушку, магчыма, прызначана было стаць аграномам або ветэрынарам. Але лёс распарадзіўся інакш.

Сельскі хлопец вывучыўся іграць на старэнькім гармоніку самастойна, ледзьве не ўпотай. Інструмент быў не яго — старэйшага брата Андрэя. Іграць хацелася суткі напралёт: у клубе на танцах, на вясковым вяселлі — любая нагода была б дарэчы. Калі ў 1936-м па суседстве ішлі ваенныя вучэнні, даў «сольны» канцэрт для чырвонаармейцаў. Камандзіру часці так спадабалася выступленне вясковага хлапчука, што ён напісаў ліст у маскоўскую газету: маўляў, хлопцу трэба дапамагчы — гэта сапраўдны самародак. «Комсомольская правда» не засталася безуважнай. У вёску Чырвоны Бераг прыйшло накіраванне на падрыхтоўчае аддзяленне ў Мінскае музычнае вучылішча. І зноў нечаканы паварот. Андрэй, які скончыў ваеннае вучылішча і пачынаў афіцэрскую службу ў Ленінградзе, выклікаў Пятра да сябе. Браты Гаварушкі пайшлі ў кансерваторыю на праслухоўванне да самога рэктара Паўла Серабракова. Пасля чаго знакаміты музыкант распарадзіўся: залічыць хлопца ў вучылішча пры кансерваторыі, пасяліць у інтэрнаце, выдаць баян для заняткаў.

Вайна пачалася за тры тыдні да яго 18-годдзя. Замест арміі ўзялі ў канцэртную брыгаду. Студэнты-музыканты іграліна прызыўных пунктах. Пад баян развітваліся і абіхалі вярнуцца жывымі. Неўзабаве іграліўжо для яго: паўналетні Пётр Гаварушка стаў байцом 4-й дывізіі Народнага апалчэння.

Былі цяжкія баі на подступах да Ленінграда. Зімой 1941–1942 гадоў ён служыў у роце баявой аховы, якая суправаджала машыны з боепрыпасамі цераз Ладагу па «Дарозе жыцця». Зіма была жудаснай: не да музыкі. Але аднойчы стары баян аказаўся ў руках, і Гаварушка вырашыў парадаваць сваіх калег. Гучалі народныя песні, класіка. Іграў салдат натхнёна і радасна, як калісьці для землякоў у роднай вёсцы. Разам з байцамі яго слухаў палонны немец, якога везлі ў штаб палка. Ён пазнаў мелодыю Баха, усміхнуўся і вымавіў назву горада — Клінгенталь.

Ва Усурыйску і ў Сцерлітамаку, у Якуціі і Херсоне, які стаў нечакана замежжам, у гарадах і вёсках роднай для яго Беларусі, у Прыбалтыцы, Балгарыі і Швецыі вучыліся іграць па яго дапаможніках. Ён быў шчаслівы.

Праз 30 гадоў Пётр Іванавіч будзе ў гэтым гарадку, знакамітым на ўвесь свет фабрыкай акардэонаў «Weltmeister». Тут будуць выступаць яго студэнты, заваюючы самыя прэстыжныя ўзнагароды. Зімой 1941-га гэта не магло нават прысніцца …

Летам 1942-га ў часцях Ленінградскага флоту аб'явілі агляд самадзейнасці. Яфрэйтара Гаварушку, пераможцу, адкамандзіравалі ў франтавы ансамбль. Спачатку — у ансамбль Неўскай аператыўнай групы, потым — 67-й арміі. 5–7 выступленняў на дзень: шпіталі, зямлянкі, акопы. Пад Шлісельбургам паранілі. Выжыў. Вайну скончыў у Курляндыі. Вярнуўся ў Ленінград з баявымі ўзнагародамі. Пачынаць прыйшлося з нуля. Чатыры ваенныя гады не палічылі нават за адзін вучэбны курс.

Вучылішча скончыў з адзнакай. Пачаў выкладаць. Паралельна — музычная школа. Для выканаўцы-народніка тады, у 1950-я гады, была адзіная магчымасць вучыцца далей, атрымліваючы вышэйшую музычную адукацыю ў Маскве, у музычна-педагагічным вучылішчы імя Гнесіных.

Дарэчы, прафесійнае навучанне выканаўцаў на баяне пачалося ў 1927 годзе. Пасля вайны інструмент набыў велізарную папулярнасць. Класы баяна (як і аркестры баяністаў) ствараліся ў музычных школах па ўсёй краіне. У 1960-я паўстала пытанне: патрэбны спецыялісты з вышэйшай адукацыяй. У Ленінградскай кансерваторыі адкрылі першую ў краіне кафедру народных інструментаў. Пётр Гаварушка стаяў ля яе вытокаў, быў сярод тых, хто фарміраваў метадычныя прынцыпы выканальніцкай школы. Яму было чым дзяліцца: выкладчыцкі вопыт, дырыжорская практыка (шмат гадоў заставаўся мастацкім кіраўніком аркестра баяністаў Выбаргскага Палаца культуры г. Ленінграда).

Патрэбны былі дапаможнікі, вучэбная літаратура. Пётр Іванавіч пісаў іх начамі на пяціметровай кухні «хрушчоўкі». Заснуць дзеці, сціхне тэлефон. Надыходзіў яго час. Створана звыш 50 метадычных, рэпертуарных зборнікаў для выдавецтваў «Музыка», «Савецкі кампазітар». «Школа ігры на баяне» вытрымала сем выданняў. Гэта — кніга для ўсіх, хто ўзяў у рукі баян у любым узросце. Агульны тыраж работ прафесара Гаварушкі — амаль 2 мільёны асобнікаў. Ён ездзіў з майстар-класамі па краіне, узначальваў журы ўсесаюзных, рэспубліканскіх, абласных конкурсаў баяністаў, удзельнічаў у канферэнцыях. Прыйшоўшы ў кансерваторыю ў 1960-м, у 1964-м узначаліў кафедру народных інструментаў. Восем гадоў — прарэктар па вучэбнай рабоце. Не адзін год працаваў плячо ў плячо з рэктарам, народным артыстам СССР Уладзіславам Чарнушэнкам. У 1978-м яму прысвоілі званне заслужанага дзеяча мастацтваў Расіі. За гэтыя гады кафедрай народных інструментаў было падрыхтавана 500 музыкантаў. Многія сталі ўладальнікамі самых прэстыжных узнагарод.

Апошняе яго «дзецішча» — міжнародны фестываль выканаўцаў на народных інструментах «Балтыка-гармоніка». Ён задумаў яго ў сярэдзіне 1990-х. Не лепшы быў час для падобных пачынанняў. Нейкім цудам задума ажыццявілася. Давялося біць на канцэртах самага першага фестывалю. У той час на ўсю моц грымела слава «бандыцкага Пецярбурга». Па вечарах нават на Неўскім праспекце было нешматлюдна. Транспарт працаваў з перабоямі. А ў асабняку барона фон Дэрвіза на Галернай вуліцы глыбокай ноччу гучала народная музыка. Столькі радасных твараў у смутныя, няўсмешлівыя 1990-я больш нідзе бачыць не даводзілася, прызнаюся шчыра: гэта было сапраўднае свята аднадумцаў.

У апошні вечар фестывалю Гаварушка выйшаў аб'явіць імёны пераможцаў. Усе ўсталі. Авацыі доўжыліся паўгадзіны, не менш. А пасля гала-канцэрта пераможцы выстраіліся ў чаргу па аўтографы. Высветлілася, што ва Усурыйску і ў Сцерлітамаку, у Якуціі і Херсоне, які стаў нечакана замежжам, у гарадах і вёсках роднай для яго Беларусі, у Прыбалтыцы, Балгарыі і Швецыі вучыліся іграць па яго дапаможніках. Ён быў шчаслівы.

«Балтыку-гармоніку» яшчэ некалькі гадоў праводзілі яго аднадумцы, назвалі іменем Пятра Гаварушкі. У пачатку новага стагоддзя перайменавалі ў «Петрапаўлаўскія асамблеі». Чаму? Тлумачэнне простае. Пётр — імя Гаварушкі. Павел — гэта Павел Смірноў — віртуоз-выканаўца, заслужаны артыст Расіі. Яго імя носіць і сёння аркестр баяністаў Камітэта па адукацыі ўрада Санкт-Пецярбурга. Разам яны стварылі знакамітую ленінградскую-пецярбургскую выканальніцкую школу, якая спалучыла лепшыя традыцыі народнай музыкі з дасягненнямі акадэмічнага выканання.

У Ленінградскай кансерваторыі адкрылі першую ў краіне кафедру народных інструментаў. Пётр Гаварушка стаяў ля яе вытокаў, быў сярод тых, хто фарміраваў метадычныя прынцыпы выканальніцкай школы.

Дзіўны быў фестываль! Дэмакратычны: хлапчукі-баяністы выступалі ў сваёй групе, віртуозы-лаўрэаты і народныя артысты — у сваёй. Без узроставых абмежаванняў. Выступалі салісты, ансамблі, аркестры. Нязменныя патрабаванні да рэпертуару — разам з народнымі мелодыямі выконваць творы сусветнай класікі. У праграме былі прадстаўлены ўсе віды гармонікаў — любімы ў народзе баян, папулярны ў Еўропе акардэон; а яшчэ губныя гармонікі, канцэрціна, банданеон — на ім ігралі мелодыі аргенцінца П'яцолы. Геаграфія гэтых конкурсаў уражвала тады, уражвае і сёння. Расія — 72 гарады. Былы Савецкі Саюз. Сярод іх і пасланцы Беларусі. А ўсяго 18 краін — ад Іспаніі да Кітая.



Набраў у пошукавіку назву «Балтыка-гармоніка», каб даведацца, які сёння яго лёс. Фестываляў было сем. Цяпер, відаць, паўза. З цяжкасцямі змагацца можна было. З цэнамі рынку, відаць, не атрымалася. Энтузіязмам і любоўю да мастацтва іх не адолееш… Веру, дзецішча Пятра Гаварушкі адродзіцца. Цікавасць да народных інструментаў ёсць. І ў Расіі, і ў Беларусі. На кафедры народных інструментаў сёння вучацца студэнты не толькі з еўрапейскіх краін, але і з Кітая, Паўднёвай Карэі. Іх вучаць па методыцы Гаварушкі. Выканальніцкія традыцыі жывыя. Вось нядаўняя навіна. Другі адкрыты гарадскі фестываль юных выканаўцаў на народных інструментах імя П. І. Гаварушкі прайшоў вясной 2014 года ў канцэртных залах Санкт-Пецярбурга. У фестывалі бралі ўдзел 126 дзяцей і падлеткаў з 36 навучальных установ. Гучалі баян, домра, балалайка, гуслі звончатыя. Усе ўдзельнікі былі адзначаны граматамі з іменем Пятра Гаварушкі. Мелодыя для баяна, якую асвоіў у вёсцы на Гомельшчыне беларускі хлопец, якую ён, стаўшы прафесарам, здолеў за паўстагоддзя ўзняць на сусветны ўзровень прафесійнага мастацтва, што патрабуе ад выканаўцы яркай індывідуальнасці, мастацкай выразнасці, высокага майстэрства, працягвае жыць і сёння.

Мансур АРЫФУЛІН

■ ПраСПОРТ

УСЯГО ТОЛЬКІ НІЧЫЯ

Беларусы стартавалі ў адборы да чэмпіянату Еўропы з нічыёй у матчы з Люксембургам (1:1)

Нават складана апісаць, што здарылася з камандай Георгія Кандрацьева на люксембургскім стадыёне «Жозі Бартэль». Тое, што там адбылося, дазволіла Жанатану Жуберу, галкіперу сціплай зборнай Вялікага Герцагства, пасля сустрэчы прызнацца: «Шкада, што не здолелі давесці да перамогі матч з камандай, якая дакладна не выглядала лепш за нас».

Так, за апошнія гады зборная Люксембурга значна «падрасла». Цяпер за зборную гуляюць ужо дзевяць прафесіяналаў, а не адзін Джэф Штрасэр, як гэта было на працягу многіх гадоў. Нягледзячы на гэта, калі зборная Беларусі хоча гуляць у фінальных стадыях чэмпіянатаў свету і Еўропы, яна мусіць «трушчыць» падобныя каманды, як арэшкі, і не ствараць з іх для сябе невырашальныя шарады. А ў матчы з «люксамі» ўсё ледзь не атрымалася наадварот. На выходзе 20-й хвіліны беларусы маглі чатыры разы распачынаць матч з цэнтра поля. У выніку яны гэта зрабілі на 42-й хвіліне, калі мяч за спіну Гутару адправіў Ларс Герсан. Беларусы, безумоўна, лік у другой палове зраўнялі. Але, што такое 1:1 у матчы з Люксембургам?! Для балельшчыкаў застаюцца два варыянты развіцця падзей: быць апантаным аптымістам і верыць, што гэта і сапраўды выпадковасць, ці бачыць у гэтым выніку сённяшні ўзровень нашай дружыны.

Эдгар Аляхновіч у акружэнні сапернікаў.

Фота bff.by

Георгій Кандрацьеў, галоўны трэнер зборнай Беларусі:

— Прыехалі за трыма баламі, а таму вынікам я не магу быць задаволеным. Першыя гульні заўжды цяжкія. Сапернік добра настроіўся. Шалёная самаддача. Мы дрэнна кантралявалі мяч. Момантаў у нас хапала, але не забываем з тых становішчаў, з якіх павінны забіваць.

Люк Хольц, галоўны трэнер зборнай Люксембурга:

— Я мяркую, што гледачы ўбачылі цікавае і відовішчнае супрацьстаянне. Мая каманда правяла фантастычны першы тайм. Страцілі некалькі магчымасцяў. Маглі забіваць двойчы і тройчы. У другой палове нам не хапала вопытных футбалістаў, каб супакоіць гульню. Мне вельмі цяжка перадаць свае эмоцыі. Аднак мы ўсцешаныя тым, што зарабілі адзін бал.

Як гулялі сапернікі беларусаў?

Група С. Іспанія — Македонія — 5:1, Украіна — Славакія — 0:1.

Тарас ШЧЫРЫ.

■ На адлегласці

ПАКУЛЬ ЁСЦЬ ШАНС

Змяніць жыццё не позна ў любым узросце

У большасці суайчыннікаў папраўчыя ўстановы асацыююцца з калючым дротам вышкай, таблічкамі: «Стой, забараняльная зона!», ахоўнікамі і вартавымі сабакамі. Шчыра прызнацца, так думала і я. Да пэўнага часу…

У раёне аэрапорта «Мінск-1», на вуліцы Караткевіча, знаходзіцца будынак, які нічым не адрозніваецца ад іншых. Адразу і не здагадаешся, што гэта папраўчая ўстанова адкрытага тыпу № 51 Дэпартамента выканання пакаранняў МУС Беларусі па Мінску і Мінскай вобласці.

У ліку іншых катэгорый асуджаных тут адбываюць часовае пакаранне і абавязаныя асобы — пазбаўленыя бацькоўскіх правоў жанчыны, якія павінны кампенсаваць дзяржаве расходы за выхаванне іх дзяцей. **Начальнік атрада маёр міліцыі Галіна ВАСІЛЕЦ** пагадзілася правесці экскурсію, пазнаёміць са сваімі падапечнымі.

ЯК У ЗВЫЧАЙНЫМ ІНТЭРНАЦЕ

Жывуць асуджаныя ў пакоях, ці як іх тут называюць, секцыях, па восем чалавек у кожнай. Акрамя таго, яшчэ адна, значна большая па плошчы, разлічаная на 15 насельнікаў. Спальныя ложкі ў два ярусы, ёсць тумбачкі, табурэткі, халадзільнік, убудаваныя ў сцяну шафы. Словам, у наяўнасці ўвесь неабходны для паўсядзённага побыту мінімум. У некаторых пакоях — тэлевізар. Яго асуджаным можна прывезці з дому толькі па пісьмовай заяве, з дазволу адміністрацыі ўстановы. У пакоях чыста, светла, акуратна, на падаконніках — кветкі. Жанчына, дзе б ні знаходзілася, імкнецца стварыць вакол сябе ўтульнасць, камфорт.

На гэтым жа паверсе кухня, абсталяваная газавымі плітамі, сталамі. Над каструляй завіхаецца маладая жанчына.

— У кожнай з нас свой посуд. Нехта гатуе для сябе сам са сваіх прадуктаў, а іншыя кааперуюцца з суседкамі. Так зручней. Хто першы прыйшоў са змены — той і кухарыць, — распавяла Аксана. — А наогул, мы жывём дружна, стараемся падтрымліваць адна адну.

Калі б не ведала, дзе знаходжуся, то сказала б: у звычайным рабочым інтэрнаце. Адно, бадай, адрозненне ў тым, што жыццё тут падпарадкавана дысцыпліне і строгаму распарадку. Адбой у 22 гадзіны, пад'ём а 6-й раніцы, умыванне, снеданне, прыборка памяшканняў, месцаў агульнага карыстання і ад'езд на работу.

ВЫХАВАННЕ ПРАЦАЙ

— У нас заключаны дагаворы з Мінскім аўтамабільным заводам і кампаніяй «Смалявічы Бройлер». На змену дастаўляем жанчын арганізавана, аўтобусам, — расказвае Галіна Уладзіміраўна. — На птушкафабрыцы нашы падапечныя зарабляюць у сярэднім па 8 млн рублёў штомесяц. А тыя, хто працуе ў пазаўрочны час і ў выхадныя, яшчэ больш — да 15 млн рублёў. Менавіта таму жанчыны маюць магчымасць разлічыцца па запазычанасці, а некаторыя — і аднавіць свае правы на дзяцей, якія знаходзяцца пад апекай дзяржавы ці сваякоў. Напрыклад, сёлета адна з асуджаных, якая вызвалілася датэрмінова, разлічылася з дзяржавай і вярнула сваіх дзяцей. Жанчына не захацела сыходзіць з МАЗа, працуе там да гэтага часу. У Смалявічах пасля вызвалення асуджаных, як правіла, з птушкафабрыкі звальняюць, дык яны просяць іх пакінуць, бо там вельмі добрыя заробкі.

Пад кантролем супрацоўнікаў папраўчай установы гэтыя работніцы працуюць добра, на работу з'яўляюцца без спазненняў, не парушаюць дысцыпліну. Але дзе гарантыя, што пасля заканчэння тэрміну зняволення не сарвуцца?..

— Акрамя таго, нам штомесяц дадаткова выдзяляюць 300 тыс. рублёў на пакупку прадуктаў харчавання ў фірмавай краме птушкафабрыкі, — дадае старэйшая па секцыі Вольга. — На прадпрыемстве таксама даступная па цэнах сталовая. Вядома, хацелася б застацца на фабрыцы і пасля вызвалення. На волі цяжка знайсці працу з добрымі заробкамі.

Сапраўды, жанчыны, што адбываюць пакаранне, пераважна маюць сярэднюю, а то і незакончаную сярэднюю адукацыю. Ім, як правіла, пасля выхаду з установы прапаноўваюць работу прыбіральшчыцы, дворніка, гардэробшчыцы. Але і кіраўніцтва прадпрыемства зразумець можна. Пад кантролем супрацоўнікаў папраўчай установы гэтыя работніцы працуюць добра, на работу з'яўляюцца без спазненняў, не парушаюць дысцыпліну. Але дзе гарантыя, што пасля заканчэння тэрміну зняволення не сарвуцца?.. Такія выпадкі не рэдкасць.

КАБ МАМА БЫЛА ПОБАЧ

— Не выключана такая небяспека, што пасля выхаду на волю яны зноў трапяць у кампанію былых сяброў. І ў гэтым не толькі іх віна, — канстатуе Галіна Васілец. — Нярэдкія выпадкі, калі ў асуджаных ёсць куды вярнуцца, ды родныя катэгарычна супраць, каб яны жылі разам з імі пад адным дахам. А тым, хто спатыкнуўся, але хоча памяняць сваё жыццё, вельмі патрэбна маральная падтрымка, узаемаразуменне блізкіх людзей. У адваротным выпадку чалавек можа зноў пакаціцца па нахіленай. Некаторыя наогул баяцца волі, баяцца быць нікому не патрэбнымі і нават не хочуць пакідаць сцены ўстановы. Мы ў сваю чаргу перад заканчэннем тэрміну пакарання высвятляем праз участковага міліцыянера, сацыяльныя службы, ці ёсць асуджанай куды вярнуцца, ці ёсць жыллё.

Разам з тым многія жанчыны ўпэўнены, што іх чакаюць дома і бацькі, і дзеці.

— Мне 31 год, але ж мне хочацца, каб мама была побач. А мае ж дзеткі яшчэ зусім маленькія і маюць яшчэ большую патрэбу ў маіх пяшчоце і дапамозе, — гаворыць адна з асуджаных. — Я маю намер разлічыцца з запазычанасцю, з чыстым сумленнем выйсці на волю і вярнуць свае бацькоўскія правы.

У другой трое непаўналетніх дзяцей: старэйшай дзяўчынцы — 10, малодшай — 6. Яны жывуць дома, пад апекай бабы і дзеда.

— Не магу паскардзіцца, бо тут ёсць усё неабходнае для жыцця. Але ж лепш сюды не трапляць — псіхалагічна цяжка без дзяцей, хочацца быць побач з імі, але разумееш, што гэта немагчыма. Выйду на волю — уладкуюся на працу. І думаю, што ў далейшым у нас будзе ўсё добра, — упэўнена маці.

Адразу відаць, што яна сумуе па сваіх малых. Акрамя абавязковых адлічэнняў, штомесяц адпраўляе дзецям грашовыя пераводы, не парушае дысцыпліну, удзельнічае ў грамадскім жыцці. За прыкладныя паводзіны яе заахвочваюць, дазваляюць наведваць сваіх дачок.

Жыццё тут падпарадкавана дысцыпліне і строгаму распарадку. Адбой у 22 гадзіны, пад'ём а 6-й раніцы, умыванне, снеданне, прыборка памяшканняў, месцаў агульнага карыстання і ад'езд на работу.

Менавіта ў папраўчай установе некаторыя жанчыны адчулі сябе жанчынамі. Папрыгажэлі, пасвятлелі тварам, бо не ўжываюць спіртнога, сочаць за сабой, карыстаюцца касметыкай. Некаторыя з іх упершыню пабывалі ў музеях, на выставах, экскурсіях, якія для іх арганізуе кіраўніцтва ўстановы. Бо на волі было не да гэтага: алкаголь, сумніўныя кампаніі… У многіх тут праявіліся творчыя здольнасці: пішуць вершы, дасылаюць іх у газеты і часопісы, малююць. Усе ахвотныя займаюцца спортам: чаму б і не, калі ёсць спартыўная зала, тэнісны стол, адпаведныя секцыі.

Дапамагае жанчынам захаваць сябе як асобу і вера. Кіраўніцтва калоніі наладзіла сувязі з праваслаўнай царквой. Святары наведваюць асуджаных, праводзяць з імі духоўныя гутаркі. У сваю чаргу жанчыны ходзяць у царкву, а таксама прыбіраюць могілкі. Тым, хто хоча вылечыцца ад алкагалізму, таксама ідуць насустрач. Па дамове з урачамі наркадыспансера іх бясплатна кадзіруюць. Але, бясспрэчна, на добраахвотнай аснове. Трымаюць тут сувязь з таварыствам ананімных алкаголікаў. Яго прадстаўнікі прыходзяць у папраўчую ўстанову, сустракаюцца з тымі, хто развіваўся з заганнай звычкай або толькі хоча стаць на цвярозы шлях. Лечаць у «калоніі» не толькі душу, але і цела. Асуджаныя замацаваны за 38-й паліклінікай. Хворым тут і бюлетэнь выпішуць, і працэдуры прызначаць. А калі вельмі «прыціснула», то і ў стацыянар пакладуць. Вядома ж — пад строгім кантролем супрацоўнікаў установы.

На кухні.

Ужо на выхадзе прыкмеціла на сцяне маляўнічы плакат.

— Гэта насценная газета. Яе выпускае рэдкалегія, — перахапіла мой погляд Галіна Васілец. — Вывешваем мы яшчэ і бюлетэнь з прозвішчамі парушальнікаў дысцыпліны. На жаль, ёсць і такія. Вельмі хацелася б, каб яны спыніліся, асэнсавалі свае паводзіны, а пасля адбыцця тэрміну пакарання паклапаціліся пра сваіх дзяцей. Таму змагаемся за кожную…

Сапраўды, змяніць сваё жыццё ніколі не позна. У любым узросце.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Падчас паверкі.

Фотаздымкі Сяргея НІКАНОВІЧА.

ЦЯЖКІ ПАЧАТАК

Завяршылася першая выязная серыя мінскага «Дынама» ў новым сезоне КХЛ

З дзевяці магчымых ачкоў беларускія «зубры» ўзялі толькі два. Першым сапернікам у новым сезоне для мінчан стаў фінскі «Ёкерыт», дэбютантаў КХЛ нашы хакеісты абыграліў авертайме 4:5. Сапраўдным героем паядынку стаў навічок «Дынама» Джонатан Чычу: ён закінуў тры шайбы і аддаў дзве галявыя перадачы. Вырашальны гол у вароты «Ёкерыта» ў дадатковы час забіў яшчэ адзін дынамаўскі легіянер Мэт Элісан. Каманда паказала добрую гульню, асабліва ў няроўных складах, што і адзначыў пасля матча **галоўны трэнер «зуброў» Любамір ПОКАВІЧ.**

— Пачатак аказаўся вельмі цяжкім: дзве меншасці запар, у адной з якіх мы прапусцілі гол. Але мы ўсё роўна чапляліся да канца. Перш за ўсё, нам дапамагла наша большасць. У канцы ў авертайме ў саперніка быў шанс усё вырашыць, калі гаспадары мелі перавагу. Але потым на аднаго гульца болей было ў нас, і мы вырашылі выхад сустрэчы.

Наступны прыпынак мінчан адбыўся ў Рызе. На лёд з мясцовым «Дынама» выйшаў наш капітан Аляксей Калюжны, які аднавіўся пасля складанай аперацыі. Паядынак атрымаўся роўны, абедзве каманды мелі шмат галявых момантаў, аднак рыжане рэалізавалі іх лепш, таму і перамаглі з лікам 4:2. На лёдзе ў складзе мінскага «Дынама» зноў саліравалі легіянеры, шайбы ў вароты рыжан закінулі Джонатан Чычу і Пол Шчэхура. Лідар «зуброў» **Джонатан ЧЫЧУ быў прызнаны лепшым нападаючым першага тыдня КХЛ.**

— Дзіўны матч. Быццам бы пачалі добра, закінулі, вялі ўліку. Гулялі выдатна, але затым пачалі зарабляць выдаленні, і гаспадары скарысталіся большасцю. Другі гол рыжан стаў для іх самым важным, але ключавую ролю, лічу, адыгралі гэтыя самыя выдаленні. Яны надалі сапернікуімпульс, і рыжане закінулі пару шайбаў. Наогул, лічу, у стартавых матчах «Дынама» глядзелася добра. Цяжка супрацьстаяць камандам, якія праводзяць першыя хатнія матчы сезона — гэта дае сапернікам дадатковую энергію. У стартавых перыядах абедзвюх сустрэч гулялі ўпэўнена. У Хельсінкі выдатна выступілі ў большасці, таму і перамаглі. А ў Рызе ў колькаснай перавазе паспяхова дзейнічалі гаспадары. Часам вырашальнымі аказваюцца менавіта такія фактары, — адзначыў Джонатан Чычу.

Апошні паядынак першай выязной серыі хакеісты мінскага «Дынама» правялі з піцерскім СКА. У гэтым матчы сваё слова нарэшце сказалі і беларускія гульцы. У КХЛ за «Дынама» дэбютаваў Арцём Волкаў, вароты выдатна абараняў Дзмітрый Мільчакоў, а шайбы на рахунку Дзмітрыя Мялешкі і Артура Гаўруса. Аднак гэта не дапамагло зарабіць мінчанам яшчэ тры ачкі. Пры ліку 3:2 на карысць піцерцаў Любамір Покавіч зняў варатара, што дазволіла гаспадарам закінуць яшчэ дзве шайбы. Часу на тое, каб адыгрыцца, ужо не заставалася.

— Думаю, што гульня была цікавая не толькі для заўзятараў, але і для камандаў. Вынік доўга быў роўным, мы да апошніх секундаў спрабавалі зраўняць. У нас было некалькі вельмі добрых момантаў, нават у пустыя маглі забіць, але не атрымалася. Мы рыхтаваліся да гульні ўшасцёх у канцы матча, у нас было некалькі добрых момантаў, калі завяршалі камбінацыю кідком, два разы амаль пацэлілі, але не атрымалася ў выніку, — адзначыў Покавіч.

Наступныя матчы «Дынама» правядзе ў Мінску: 12 верасня нашы хакеісты сустрэнуцца з «Атлантам», 14-га — з ЦСКА, 18-га — з «Поўначсталлю»; завершаць хатнюю серыю мінчане гульнёй супраць «Тарпеда» з Ніжняга Ноўгарада.

Як праявілі сябе іншыя беларусы ў першы тыдзень новага сезона КХЛ

Андрэй Сцяпанаў стаў аўтарам першага беларускага гола ў новым сезоне КХЛ, пазней яго ж шайба дапамагла «Нафтахіміку» перамагчы «Трактар».

Андрэй Стась у гульні супраць «Дынама» з Масквы каньком адправіў шайбу ў вароты свайго армейскага клуба.

Джэф Плат закінуў дзве шайбы і аддаў галявы пас у гульні з рыжскім «Дынама», што дапамагло «Лакаматыву» перамагчы.

Дзве шайбы **Андрэя Касціцына** дапамаглі «Трактару» абыграць «Тарпеда».

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

■ Прыватны інтарэс

ТАМ, ДЗЕ СПЕЕ ВІНАГРАД...

Зялёны, а таксама жоўты, чырвоны, ружовы, сіні... На падворку Ігара Раўкача знойдзеш усялякі!

Стэнд з вінаградам на свяце горада Давыда вось ужо другі год прыцягвае маю ўвагу. Ды і не толькі маю. Каля яго збіраюцца як гараджане, так і госці Давыд-Гарадка, што ў Столінскім раёне. І ва ўсіх адно пытанне: няўжо ў нашых умовах можна вырасціць вось такі вінаград?! А яго гаспадар — жыхар старажытнага горада Ігар Уладзіміравіч Раўкач — адказвае: «Не толькі можна, а і трэба».

Ігар Уладзіміравіч РАЎКАЧ з амаль трохкілаграмовай вінаграднай гронкай.

Сёлета на сваім стэндзе Ігар Уладзіміравіч размясціў 20 сартоў вінограду — «Восторг мускатный», «Восторг-2», «Находка», «Татарский», «Надежда АЗОС», «Тимур», «Виктор», «Алёшенькин»... І калі напрошвалася ў госці да вінаградара, дык чакала ўбачыць сартоў 20-25. Але тое, што ўбачыла, уразіла яшчэ больш. Каля сядзібы Раўкача выдатна сябе пачуваюць... аж 54 сарты вінограду!

Ігар Уладзіміравіч пачаў займацца вінаградарствам не так даўно — тры гады таму. Але «захварэў» ён гэтай справай настолькі сур'ёзна, што зараз пра сам вінаград не толькі ведае даволі шмат, а і дае кансультацыі па яго вырошчванні, актыўна вядзе перапіску на форумах па вінаградарстве, ездзіць на выстаўкі, сёлета сам плануе выставіць самыя вялікія і прыгожыя вінаградныя гронкі.

Невялікі ўчастак гаспадароў каля чатырохкватэрнага дома практычна цалкам аддадзены вінограду. Ігар Уладзіміравіч пачынае экскурсію ад кустоў перад домам, пасля вядзе за дом, праводзіць па невялікай цяпліцы.

— У цяпліцы вырошчваю яго толькі для таго, каб паскорыць тэрмін выспявання сартоў. Спрабую, эксперыментую, — расказвае гаспадар.

На самой справе мы бачым той жа вінаград і на вуліцы, і пад плёнкай. Ігар Уладзіміравіч лёгка называе сарты, паказвае іх, расказвае пра якасці кожнага, пра тое, як і з якога віду быў выведзены менавіта гэты. Назваў столькі, што проста немагчыма ўсё запомніць. І практычна ўсе ягады ўжо налітыя, салодкія, так і просяцца на стол. Розныя колер, памер, смак, форма ягад. Столькі розных сартоў нідзе не бачыла. Кіш-міша тут два сарты — «Находка» і «342», адзін з самых ранніх — «Виктор», непатрабавальная «Виктория», з вялікімі ягадамі — «Преображение», з сярэднім тэрмінам паспявання — «Красавчик», да трох кілаграмаў вагі дасягае гронка «Юбилея Новочеркасского». Пра ўсе 54 найменні нават і не напішаш. Спытала ў гаспадара пра любімы сорт:

— Ды пакуль не знайшоў свой, — усміхаецца ён.

Гэта адказ вінаградара. А на мой погляд, усе прадэгуставаныя сарты ў Ігара Уладзіміравіча вельмі смачныя. Зразумела, ёсць адрозненне па смаку, але ў кожнай ягады знаходзіш нешта адметнае.

Ігар Уладзіміравіч кажа, што іншым часам даводзіцца развітвацца з той ці іншай лазою. Калі сорт не спадабаўся, то гаспадар яго адразу выкідае са свайго агарода, бо іншым, больш дасканалым і любімым, патрэбна месца. Здараецца, набывае новы сорт — а аказваецца падробка. Тады шкада не столькі сродкаў, колькі часу, затрачанага на вырошчванне. Бо пабачыць, што ты насамрэч набыў, можна часам і праз некалькі гадоў.

Ігар Уладзіміравіч сам разводзіць вінаград. Стварыў патрэбныя ўмовы па цеплыні (з тэрмарэгулятарам), падтрымлівае тэмпературу як паветра, так і прыкарнявую. У выніку з «палачак», абрэзаных з вінограду, вырастаюць новыя саджанцы.

Расказаў ён і пра іншыя спосабы размнажэння расліны: зрабіць надрэз на галінцы, якая ідзе ад вінаградніка, апрацаваць месца «Корневинам» і прыкапаць (прычапіць) да зямлі. Калі галінка пусціць карані, акуратна адрэзаць яе ад дарослай расліны.

Таксама вінаград прышчэпліваюць. Як і на яблыні, на адным вінаградным кусце могуць расці некалькі сартоў. Толькі лепш падбіраць сарты прыкладна аднаго тэрміну паспявання.

Вядома, вінаград трэба апрацоўваць. Ігар Уладзіміравіч пачынае апрацоўку медным купарвасам пасля адкрыцця вінаграднікаў, калі на іх з'яўляюцца першыя пупышкі. Пасля прымяняе «Рыдаміл голд МЦ», «Тапаз», а калі ягады пачынаюць паспяваць, то «Фітаспарын». Ён чаргуе розныя прэпараты ад захворванняў, каб не было прывыкання.

На зіму вінаграднікі абразаюцца (пакідаецца 4-5 пупышак), прыгінаюцца да зямлі і прышчэпліваюцца, а пасля накрываюцца. Лепшым матэрыялам для гэтага вінаградар лічыць падложку пад ламінат: танна і зручна. Акрамя гэтага, у ход ідзе апалая лістота, старая вопратка і многае іншае.

— Зараз займацца вінаградарствам вельмі проста. Ёсць вялікая колькасць сайтаў, форумаў, дзе аб'яднаны вось такія «хворыя», — смяецца Ігар Уладзіміравіч. — Мы перапісваемся, даём парады адзін аднаму. Ёсць спецыяльныя праграмы для вызначэння захворванняў раслін. Я таксама даю парады, прапаную кожнаму паспрабаваць вырасціць вінаград. Гэта карысныя ягады, якія растуць у нас без нейкіх асаблівых клопатаў.

Таццяна СЕГЕН, фота аўтара

ДЗЯРЖЗАКАЗ ГАРАНТУЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Аднак прапанаваны цяпер аб'ём ільготных крэдытаў увесь кошт кватэры не пакрые...

— Гэтага і не павінна быць. Астатнюю частку чалавек аплочвае ўласнымі сродкамі. І гэтая частка часам даволі значная. Лічыце самі. Арганізатару такога будаўніцтва даецца льготны крэдыт пад 100% кошту ўсяго жылля, а грамадзяніну — толькі пад пэўны працэнт агульнай плошчы кватэры і пад пэўны кошт квадратнага метра. Фактычна кошт квадратнага метра вышэйшы, чым нарматыўная цана «квадрата», пад якую ажыццяўляецца льготнае крэдытаванне. Напрыклад, цяпер людзі атрымліваюць ільготныя крэдыты ў такім памеры, калі кошт квадратнага метра будучага жылля лічыцца 6 млн 100 тысяч рублёў. А рэальны кошт «квадрата» дасягае 8-10 млн рублёў. Таму гэтую розніцу паміж нарматыўнай і рэальнай цаной квадратнага метра, а таксама грошы за лішнія метры, якія не крэдытуюцца, чалавек павінен гасіць уласнымі сродкамі.

Напрыклад, цяпер людзі атрымліваюць ільготныя крэдыты ў такім памеры, калі кошт квадратнага метра будучага жылля лічыцца 6 млн 100 тысяч рублёў. А рэальны кошт «квадрата» дасягае 8-10 млн рублёў.

— Атрымліваецца, што для чаргавікоў сёння «лёгкіх» кватэр ужо няма, як гэта існавала пры мінулай сістэме льготнага крэдытавання?

— Згодзен. Нават з выкарыстаннем ільготнага крэдытавання чалавеку для атрымання кватэры сёння трэба мець сур'ёзныя ўласныя накапленні. З падобным механізмам можна згаджацца ці не, але ён існуе. А іншага дзяржава не прапануе. Калі кліент адмаўляецца будавацца на гэтых умовах (не хапае грошай, не падабаецца праект дома ці нешта іншае), то ён застаецца ў чарзе, а гэты варыянт прапануюць наступнаму чалавеку па чарзе. Распрацаваная схема атрымання жылля па дзяржзаказе даволі простая і зразумелая. Прапанова кватэр ажыццяўляецца згодна з існуючай чаргой, калі паралельна выкарыстоўваецца механізм ільготнага крэдытавання згодна з указам № 13.

— Кажуць, што будтрэстам узводзіць дамы па дзяржзаказе стала прасцей, аднак і адказнасць павялічылася...

— Плюсам для будаўнічых упраўленняў з'яўляецца тое, што цяпер арганізацыя атрымлівае 100-працэнтнае фінансаванне аб'екта з боку банка. Гэта выключае зацягванне будаўніцтва дома па прычыне недафінансавання з боку грамадзян. У ідэале банкі павінны заўсёды своечасова накіроўваць крэдытныя рэсурсы забудоўшчыкам. А гэта дазваляе ажыццяўляць будаўніцтва жылых дамоў выключна ў запланаваны тэрмін і па каштарыснай цане. Цяпер, калі будаўнічая арганізацыя ўзводзіць жылы аб'ект пазней нарматыўнага тэрміну, то гэта ўжо цалкам яе праблема. Сёння ўпраўленню капітальнага будаўніцтва ўжо не акрэдытуюць цану будаўніцтва, якая будзе вышэйшай за каштарысную. Таму будтрэст будзе вымушаны пакрываць такія выдаткі за ўласныя сродкі.

Калі будаўнічая арганізацыя ўзводзіць жылы аб'ект пазней нарматыўнага тэрміну, то гэта ўжо цалкам яе праблема.

— Ці працуе ў гэтай сістэме прынцып «перніка», калі за дакладную арганізацыю будаўніцтва трэсты могуць атрымаць дадатковы даход?

— Такі механізм прадугледжаны. У межах атрыманых ільготных крэдытаў (паводле ўказа №270), калі жыллё будуецца танней, чым гэта прагназавалася, то сэканомленыя грошы застаюцца ў заказчыка. Такім чынам, цяпер будаўнікі зацікаўлены працаваць лепш, з выкарыстаннем новых, больш прагрэсіўных метадаў.

— А насельніцтву па гэтай сістэме стане «дыхаць лягчэй»?

— Для людзей галоўным плюсам сістэмы дзяржзаказу з'яўляецца фіксаваны кошт квадратнага метра іх кватэры. Цяпер чаргавікі адразу ведаюць канчатковую цану свайго жылля. У банку ім падлічаць аб'ём крэдытавання, пасля чаго сям'я ўжо ведае і дакладную суму ўласных грошай, якую неабходна заплаціць будтрэсту. Пры ранейшай сістэме льготнага крэдытавання на старце будаўніцтва канчатковы кошт жылля не ведаў ніхто.

— Апошнім часам у сеціве пайшла гуляць пагалоска, што льготнае крэдытаванне жылля Беларусбанкам будзе звужацца...

— Аб'ёмы льготнага крэдытавання на жыллёвае будаўніцтва вызначае Мінфін, а Беларусбанк толькі з'яўляецца рэтранслятарам гэтых фінансавых плыняў, пры гэтым ён выдзяляе сродкі і з уласных рэсурсаў. І функцыю сваю ён выконвае бездакорна. Паводле інфармацыі на пачатак верасня, усе заяўкі будаўнічых арганізацый па крэдытных рэсурсах сёння выкананы цалкам.

— Агучце першыя вынікі будаўніцтва жылых дамоў па дзяржзаказе.

— Па лініі дзяржзаказу сёлета было пабудавана 20 дамоў. Па восем такіх дамоў было пабудавана ў Гродне і Брэсце, два дамы ўзведзены ў Віцебску і па адным — у Гомелі і Магілёве. Згодна з зацверджаным планам, яшчэ 124 шматкватэрныя дамы па сістэме дзяржзаказу будуць здадзены ў эксплуатацыю да канца гэтага года. Акрамя таго, цяпер пачалося будаўніцтва дзясяткаў жылых дамоў, якія будуць здадзены ў эксплуатацыю ў 2015 годзе.

— Кажуць, што з цягам часу кошт жылля ў сістэме дзяржзаказу будзе абмяжоўвацца ўзроўнем нашых заробкаў?

— Цяпер у сістэме дзяржзаказу пачынае дзейнічаць эксперымент па збалансаванні кошту 1 квадратнага метра жылля з памерам сярэдняй зарплаты, памножанай на каэфіцыент 1,2. Нарматыўны дакумент (указ №270) аб гэтым ужо прыняты. Цяпер вызначаецца аб'ём будаўніцтва па такім прынцыпе цэнаўтварэння квадратнага метра, удакладняецца колькасць дагавораў і дакладная плошча жылля па рэгіёнах. Спецыялістамі распрацоўваецца перспектыва ацэнкі заработнай платы на 2015-2016 гады, каб ужо сёння больш дакладна планаваць кошт квадратнага метра жылля па дзяржзаказе.

— Кошт такога збалансаванага «квадрата» ў межах эксперыменту будзе ніжэйшы за той цэннік, які існуе сёння?

— Гэта не факт. Усё залежыць ад агульнаэканамічнай дынамікі ў рэальным сектары нашай эканомікі. Як будзе павялічвацца сярэдні заробак па краіне, як зменяцца цэны на будматэрыялы, паслугі, транспарт, энергетыку і г. д.

— У мінулыя гады будаўнічую галіну сур'ёзна «трэсла» ад вялікай колькасці праблемных дамоў, якія будаваліся звыш нарматыўных тэрмінаў. Цяпер падобная сітуацыя ўжо немагчымая?

— Сёння практычна ўсе праблемныя дамы ўзведзены. Засталося толькі 7 праблемных дамоў, тэрмін будаўніцтва якіх зацягнуўся. Часам па такіх аб'ектах прымаліся жорсткія рашэнні. Таму сёння ўзнікла неабходнасць стварыць такі механізм, які б дазваляў мясцовым выканкамам у адміністрацыйным парадку замяняць нядобрасумленнага забудоўшчыка. У Мінбудархітэктуры сёння ўжо падрыхтаваны праект пастановы Саўміна аб выпадках і парадку замены забудоўшчыка, пры парушэнні апошнім дагаворных абавязкаў у долевым будаўніцтве.

Згодна з зацверджаным планам, яшчэ 124 шматкватэрныя дамы па сістэме дзяржзаказу будуць здадзены ў эксплуатацыю да канца гэтага года.

Гэты дакумент дае права мясцовым выканкамам пры выяўленні сур'ёзных негатыўных момантаў з боку забудоўшчыкаў прымаць адпаведныя захады. Тут узнікае магчымасць пераразмеркаваць зямельны ўчастак, адабраць аб'ект незавершанага будаўніцтва і прызначыць на яго новага забудоўшчыка. Дакументам тлумачыцца механізм узаемаразлікаў паміж старым і новым забудоўшчыкамі. Тут будзе вызначацца канкрэтны «кватэрны» лёс грамадзян-дольшчыкаў у гэтай сітуацыі. Напрыклад, удакладняецца алгарытм — на якіх умовах дольшчыкі працягнуць будаваць жыллё з новым забудоўшчыкам, або калі яны вырашаць выйсці з гэтай сістэмы. Тут шмат пытанняў па кошце такога жылля, прынцыпах дадатковага крэдытавання і г. д. Увесь гэты комплекс неабходных дзеянняў будзе прапісаны ў адным дакументе.

— Дзякуй за гутарку.

Сяргей КУРКАЧ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

белагропромбанк
традиции будущего

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2014 г.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2014 год	2013 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		867 748	935 333
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		7 254	7 799
4	Средства в Национальном банке	1103		4 460 918	4 384 117
5	Средства в банках	1104		1 697 241	1 244 371
6	Ценные бумаги	1105		10 137 400	5 818 581
7	Кредиты клиентам	1106		49 937 225	48 960 081
8	Производные финансовые активы	1107		-	26
9	Инвестиции в зависимые юридические лица			-	-
10	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица			-	-
11	Долгосрочные финансовые вложения	1108		210 757	210 119
12	Основные средства и нематериальные активы	1109		3 630 699	3 362 592
13	Имущество, предназначенное для продажи	1110		2 097	1 850
14	Отложенные налоговые активы	1111		-	-
15	Деловая репутация			-	-
16	Прочие активы	1112		928 906	840 418
17	ИТОГО активы	11		71 880 245	65 765 287
18	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
19	Средства Национального банка	1201		3 332 505	3 529 334
20	Средства банков	1202		8 590 328	9 484 636
21	Средства клиентов	1203		41 778 685	35 177 590
22	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		5 653 892	5 575 840
23	Производные финансовые обязательства	1205		936	175
24	Отложенные налоговые обязательства	1206		480	-
25	Прочие обязательства	1207		779 213	846 457
26	ВСЕГО обязательства	120		60 136 039	54 614 032
27	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
28	Уставный фонд	1211		6 803 591	6 803 591
29	Эмиссионный доход	1212		-	-
30	Резервный фонд	1213		938 824	510 552
31	Фонды переоценки статей баланса	1214		1 775 289	1 714 454
32	Накопленная прибыль	1215		2 190 671	2 091 698
33	Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации – банку			11 708 375	11 120 295
34	Доля неконтролирующих акционеров			35 831	30 960
35	ВСЕГО собственный капитал	121		11 744 206	11 151 255
36	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12		71 880 245	65 765 287

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–июнь 2014 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2014 год	2013 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		4 645 028	4 869 024
2	Процентные расходы	2012		3 670 427	3 553 310
3	Чистые процентные доходы	201		974 601	1 315 714
4	Комиссионные доходы	2021		516 709	488 004
5	Комиссионные расходы	2022		106 704	112 570
6	Чистые комиссионные доходы	202		410 005	375 434
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		146	478
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(6 095)	8 931
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		224 969	79 421
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		(1 634)	(3 254)
11	Чистые отчисления в резервы	207		204 043	435 646
12	Прочие доходы	208		580 403	576 249
13	Операционные расходы	209		1 127 336	979 976
14	Прочие расходы	210		128 700	127 940
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		722 316	809 411
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		143 502	234 534
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		578 814	574 877
18	Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц			-	-
19	Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц			-	-
20	ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)			578 814	574 877
21	Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку			573 495	572 228
22	Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке)			5 319	2 649
23	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях				
24	Базовая прибыль на простую акцию	22		-	-
25	Разводненная прибыль на простую акцию	23		-	-

И.о. Председателя Правления **Н.П.Шевцова**

Главный бухгалтер **М.А.Шаповалова**

Дата подписания «28» августа 2014 г.

http://www.belapb.by/rus/about/bank-activity/indexes/finansovaya-otchetnost-bankovskogo-holdinga/konsolidirovannaya-kvartalnaya-otchetnost/?fp=na-otchetnuyu-datu-01-07

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь.
УНП 100693551.

■ Фондавы рынак

БОЛЬШ ЗА 22,5 ТЫСЯЧЫ АКЦЫЙ

Завершаны продаж каштоўных папер Гомельскага тлушчавага камбіната

Па звестках Агенцтва дзелавых сувязяў, за 33 гандлёвыя дні на Беларускай валютна-фондавай біржы прададзеныя 22603 простыя акцыі ААТ «Гомельскі тлушчавы камбінат» дадатковага выпуску на амаль 425 млн беларускіх рублёў.

Усяго адбылася 191 здзелка куплі-продажу, што дазваляе выказаць здагадку, што ў акцыянернага таварыства з'явілася прыкладна такая ж колькасць новых акцыянераў.

Мінімальны аб'ём таргоў зафіксаваны 28 жніўня, калі ў выніку трох здзелак было прададзена 55 акцый. Максімальны — 21 ліпеня, калі ў выніку трох здзелак было прададзена 5630 акцый (практычна адна чвэрць усіх прададзеных).

«Першасны аналіз біржавой інфармацыі паказвае, што ў асноўным здзяйсняліся здзелкі з невялікай колькасцю акцый (50-200 штук), на суму ў межах 1-4 мільёнаў беларускіх рублёў, што характэрна для пакупнікоў — фізічных асоб», — паведамляюць у Агенцтве дзелавых сувязяў.

«Мы ўдзячныя ўсім інвестарам, якія набылі нашы акцыі, незалежна ад таго, колькі яны акцый купілі. Мы абавязкова прааналізуем увесь ход падрыхтоўкі і правядзення размяшчэння акцый на біржы і зробім высновы. У любым выпадку атрыманы вопыт вельмі каштоўны», — заявіў дырэктар Гомельскага тлушчавага камбіната Дзмітрый Бабундзін.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

16 сентября 2014 г. в г. Бобруйске проводятся повторные аукционные торги

Незавершенное законсервированное капитальное строение (здание административно-хозяйственного назначения) по ул. Трудовой, д. 1 в г. Кричеве, пл. 7458 кв. м, зем. участок для обслуживания здания 0,3488 га. Хорошие подъездные пути. Начальная цена продажи 14 057 314 389 рублей без НДС.

Подробную информацию можно узнать по тел. 8-0225-72-01-13, 72-13-93 или на сайтах: www.bti.by, www. realt.by

УНП 102835909

ДОПОЛНЕНИЯ И ИЗМЕНЕНИЯ К ПРОЕКТНЫМ ДЕКЛАРАЦИЯМ

по объекту «Застройка жилых кварталов с объектами социальной инфраструктуры в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2 очередь строительства). Жилой дом № 18 по генплану»,

опубликованным в газете «Звязда» № 243 от 27.12.2013, № 41 от 05.03.2014

Дополнительно для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются 9 квартир на 1, 9, 10, 18, 23, 24 этажах, в том числе:

- 9 (девять) однокомнатных квартир общей площадью от 45,36 до 45,76 кв.м стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади в размере, эквивалентном **1 600 долларов США**.

Условия оплаты – первоначальный взнос в размере **30% стоимости** объекта долевого строительства в течение **10 (десяти) банковских дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – до конца строительства в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

При **единовременной** оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение **30 (тридцати) календарных дней** со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную **50 долларам США.**

Документы для заключения договоров будут приниматься **с 15.09.2014**. Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Срок действия проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, отменяющей действие настоящей.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: г. Минск, ул. Короля, 20, каб. 2, тел. (017)200-06-85, (044)795-44-44.

Сайт компании: www.uks-m.by.

УНП 190579681

НАЯЎНЫЯ ГРОШЫ ВЫХОДЗЯЦЬ З МОДЫ

Адна з асноўных задач, што стаіць перад Беларуссю сёння, — развіццё сістэмы безнаяўных разлікаў. Для таго, каб яе вырашыць, неабходна павялічыць долю разлікаў з выкарыстаннем пластыкавых картак.

Беларусбанк сістэмна і комплексна вядзе працу па павелічэнні безнаяўных плацяжоў. Таксама банк працуе над пашырэннем кола дзелавых партнёраў. **Першы намеснік старшыні праўлення Беларусбанка Генадзь ГАСПАДАРЫК** падкрэсліў, што да паслуг уладальнікаў банкаўскіх плацежных картак Беларусбанк ужо ўстаноўлена 1200 банкаматаў, што складае 29,5% рынку, 2440 інфакіёскаў (64% рынку). Больш за 28 тыс. арганізацый гандлю і сэрвісу заключылі з банкам дагавор на прыём плацяжоў. З пачатку года банк выпусціў 5,5 млн плацежных картак. Па выніках першага паўгоддзя доля безнаяўных разлікаў у агульным расходзе і асобных выдатках аперацый перавысіла 30%.

Гэты паказчык устойліва павялічваецца, аднак да кантрольнай лічбы, вызначанай пастановай праўлення Нацбанка і ўрадам краіны да 2017 года (50%) яшчэ далёка», — адзначыў Генадзь Гаспадарык.

Значную ролю ў долі павелічэння безнаяўных разлікаў адыгрываюць новыя тэхналогіі. Сёння Беларусбанк актыўна развівае сэрвіс дыстанцыйнага абслугоўвання трымальнікаў пластыкавых картак, што дазваляе рабіць разлікі па камунальных паслугах і іншых плацяжах з дапамогай дыстанцыйнага кіравання — мабільнага тэлефона альбо камп'ютара ў любы час сутак. Банк таксама праводзіць работу па ўдасканаленні саміх плацежных картак, што робіць іх больш зручным і бяспечным інструментам разліку. Беларусбанк — адзін з першых банкаў у рэспубліцы, які перайшоў на выпуск картак з мікрапрацэсарамі і ўкараніў бескантактную тэхналогію разліку.

Адна з найважнейшых умоў для пераходу на безнаяўны разлік — матэрыяльны стымул. Гаворка ідзе аб спажывецкіх зніжках. Сёння Беларусбанк заключыў больш за 700 дагавораў з арганізацыямі гандлю і сэрвісу на прадастаўленне зніжак пры разліках банкаўскімі аплатнымі карткамі. Адной з такіх праграм з прадастаўленнем зніжак з'яўляецца дагавор з гандлёвай сеткай «Еўраопт». Пачынаючы з 3 верасня, кожны ахвотны можа зарэгістраваць сваю бягучую банкаўскую картку Беларусбанка ў аддзяленні банка на ўдзел у гэтай праграме. Картка аўтаматычна становіцца дысконтнай пры выкарыстанні яе ў аплаце пакупак у гандлёвай сетцы. У дысконтнай праграме могуць удзельнічаць усе ўладальнікі пластыкавых картак незалежна ад сістэмы, да якой яны належаць. Няма неабходнасці мяняць сваю бягучую картку, дастаткова ўзяць яе і паспарт і падысці ў бліжэйшае аддзяленне банка.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

■ Арт-ідэя

Бі, бяжы, перамагай!

ВЯДОМЫЯ АРТЫСТЫ, ТЭЛЕВЯДУЧЫЯ ЗАСНАВАЛІ «БРАЦТВА КОЛЬЦА», КАБ ПАДТРЫМАЦЬ БЕЛАРУСКІХ БАСКЕТБАЛІСТАК

У нядзелю, 14 верасня, у Мінску стартуе міжнародны турнір па баскетболе памяці Сямёна Халіпскага. У гэты ж дзень, адразу пасля гульні нацыянальных баскетбольных зборных Беларусі і Кітая, у сталічным Палацы спорту адбудзецца незвычайны матч «Усход супраць Захаду». Найпершая яго адметнасць у тым, што каманды сфарміраваны не з прафесійных гульцоў, а з вядомых мужчын айчыннага шоубізнесу — спевакоў, музыкантаў, тэлевядучых. А галоўнае, арганізаваны гэты матч спецыяльна ў падтрымку беларускіх баскетбалістак на чэмпіянаце свету па баскетболе, што пройдзе сёлета напрыканцы верасня — у пачатку кастрычніка ў Турцыі.

«Пачалося ўсё зусім спантанна, — дзеліцца вытокамі ідэі саліст гурта «Чук і Гек» Павел Сыраежкін. — Мы з сябрамі абмяркоўвалі: вось многія артысты захапляюцца футболам, шмат гадоў існуе нават «зорны» футбольны клуб «Арт-Старс». А ці ёсць у нас тыя, хто цікавіцца і сам гуляе ў баскетбол? Кінулі кліч у сацыяльныя сеткі — назбіралася каля

20 чалавек, дастаткова, каб згуляць у «дваравы баскетбол» і ўзгадаць, як гэта было ў юнацтве. Але даволі хутка ідэя набыла больш глыбокі сэнс: мы вырашылі ўзняць настрой не толькі сабе, але і самай выніковай беларускай камандзе ў гульнявых відах спорту, тым больш у іх напярэдсе адказныя старты — чэмпіянат свету!».

На заклік калег па цэху адгукнуліся, напрыклад, тэлевядучыя Алег Ціткоў, Дзмітрый Кахно, Ілья Конанаў, Іван Вабішчэвіч, Віталь Воднеў, Арцём Ахпаш, спевакі Юрый Вашчук (Тэа), Арцём Міхаленка, Дзімітр Капачоў, Стэфан Како (выканаўца хіп-хопу, якога ўдзельнікі каманды жартам называюць «наш цемнаскуры легіянер»), артысты і шоўмены Павел Шастакоў, Мікалай Драчынскі, Васіль Анціпаў, Максім Югаў, Дзмітрый Новік… Зрэшты, пасля публікацыі рэпартажу і здымкаў з першай жа трэніроўкі кола ахвотных трапіць у медыязборную павялічылася практычна ўдвая. Хоць трохгадзінныя трэніроўкі нават тым артыстам, хто сябруе са спортам, даюцца зусім няпроста. «У школе я актыўна гуляў у баскетбол, таму думаў, што асаблівых цяжкасцяў не будзе — навыкі ж засталіся. Але на наступную раніцу адчуваў сябе, мякка кажучы, дзіўна», — з усмешкай дзеліцца Юрый Вашчук. «А я затое пасля нашых трэніровак, бадай, упершыню ў жыцці прабег учора пяць кіламетраў!» — амаль па-дзіцячы захапляецца тэле- і радыёвядучы Павел Шастакоў.

Назву наваспечаная зборная сабе выбрала сімвалічную — «Брацтва кольца». «Але не шукайце аналогій з Толкіенам! — папярэджвае прадзюсар і тэлевядучы Алег Ціткоў. — Адтуль мы ўзялі толькі прыгожае словазлучэнне, а вобразы зусім іншыя. Кольца ў нашым выпадку — не толькі баскетбольнае, але і кола МКАД. Мы, у прынцыпе, не «селебрыці», а проста хлопцы са спальных раёнаў Мінска — Малінаўкі, Серабранкі, Уручча… Ну, і некалькі прадстаўнікоў цэнтральнай часткі горада».

На трэніроўках, прызнаюцца, забываюць, хто з Шабаноў, а хто з Паўднёвага Захаду, і хто каму сябар ці непрыяцель — столькі запалу і эмоцый дае сама гульня. «Гэтая ідэя аб'яднала асоб, якія, як ні дзіўна, змаглі ўжыцца ў адной камандзе, хоць у прафесіі многія з нас — прамыя канкурэнты, — заўважае шоўмен Максім Югаў. — Мы яшчэ ні разу не пабіліся, уяўляеце! Затое ўжо абмяркоўваем планы на перспектыву — як добра было б не абмяжоўвацца разавай ініцыятывай, а працягваць выклікаць на бой розныя аматарскія каманды, каб папулярызаваць гульню ў баскетбол, каб нагадаць, якое гэта выдатнае і здаровае баўленне часу». А на дзве каманды для першага матча ўдзельнікі вырашылі падзяліцца па геаграфічным прынцыпе — падзяліўшы карту горада на дзве часткі.

Медыя-каманда яшчэ зусім маладая — ёй усяго крыху больш за 10 дзён. Але да падрыхтоўкі да будучай гульні ўдзельнікі падышлі вельмі адказна, прагледзеўшы рэжым нагрузак, харчавання і сну. Тое, што пераацэньваць уласныя сілы нельга і звычайныя заняткі фітнесам істотнай форы не даюць, стала зразумела ўжо на першых трэніровачных гульнях, калі некаторыя ўдзельнікі атрымалі траўмы. Трэніроўкі, дарэчы, праводзіць Юрый Воўк, вядомы як вопытны трэнер, а таксама арганізатар чэмпіянатаў краіны па баскетболе. Дый судзіць гульню ў Палацы спорту будуць таксама прафесіяналы: суддзя вышэйшай катэгорыі чэмпіянату Беларусі і суддзя міжнароднага класу (ФІБА). Гуляць будуць таксама па ўсіх правілах, 4 перыяды па 10 хвілін, а паміж чвэрцямі абяцаюць здзівіць гледачоў яшчэ і адмысловай шоу-праграмай. Каментатарам медыяматча пасля доўгіх спрэчак — бо амаль кожны прапаноўваў сваю кандыдатуру — быў абраны тэлевядучы Віталь Воднеў. А настаўнікамі камандаў «Усходу» і «Захаду» падчас матча стануць удзельніцы нацыянальнай зборнай Алена Леўчанка, Кацярына Сыціна, Таццяна Ліхтаровіч і Наталля Марчанка.

Дарэчы, на жартоўныя кпіны, маўляў, як мужчынскае эга змірылася з тым фактам, што руліць камандамі будуць дзяўчаты, «браты кольца» наперабой удакладняюць: не змірыліся, а натхніліся!

— Мы вельмі рады, што «руліць» будуць яны, а не мы, — запэўнівае Павел Сыраежкін, — інакш пачалася б такая вакханалія!

— Мужчынскі шавінізм тут не да месца, бо гульня наогул ладзіцца менавіта дзеля дзяўчат, дзеля таго, каб акцэнтаваць увагу на жаночай нацыянальнай зборнай, — падкрэслівае Алег Ціткоў. — Павучыцца ў іх будзе надзвычай цікава — і, што ўтойваць, ёсць стымул падцягнуцца ва ўсіх сэнсах гэтага слова. Паколькі ў зборнай многія дзяўчаты не замужам, а ў нас хапае халастых хлопцаў, гэта яшчэ і матывуе паказаць сябе з найлепшага боку.

— А для мяне гэта наогул цікавы вопыт, — прызнаецца дыджэй Міхаіл Руфус, — бо я апошні год бязвылазна правёў у Мексіцы, краіне, дзе ў жанчын, мякка кажучы, няшмат шанцаў праявіць сябе ў якасці кіраўнікоў.

— Вядома, хваляванне прысутнічае, — дадае Павел Шастакоў, — бо мы ўсведамляем, што дзяўчаты будуць паглядаць на нас крыху паблажліва — што з вас узяць, павыдурняйцеся ўжо… Безумоўна, такіх профі, нават, не пабаюся гэтых слоў, спартыўных куміраў, на гульню якіх раней глядзеў толькі па тэлевізары, хочацца не падвесці, хоць і ёсць сумненні, ці справішся з усімі задачамі і камбінацыямі, якія яны нам падкажуць.

З ДРУГОГА БОКУ

— Першая трэніроўка хлопцаў была проста беганінай з мячом у стылі «бі — бяжы», — дзеліцца ўражаннямі ад працы з медыяперсонамі трэнер Юрый Воўк. — Былі некалькі чалавек, якія раней сур'ёзна займаліся баскетболам і маглі скласці касцяк каманды. Але астатнія знаходзіліся на ўзроўні дваровай каманды; давялося тлумачыць і правілы, і тэхніку, і сутнасць гульні, каб гледачы, якія прыйдуць на матч, не расчараваліся.

— «Зорку» на пляцоўцы ніхто не ўключаў?

— Нават і блізка не было. Усе ж дарослыя людзі, паспяхова рэалізуюць сябе кожны ў сваёй сферы і ведаюць, дзеля чаго задумалі гэты матч. Я нікога не імкнуўся «пастроіць» — яны ведаюць мой баскетбольны аўтарытэт і таму ва ўсім, што датычыцца гульні, прыслухоўваліся да парад.

— Як мяркуеце, ці змогуць такія матчы (калі праект усё ж атрымае працяг) папулярызаваць і прыцягнуць увагу да незаслужана падзабытай гульні?

— Адназначна праект вельмі цікавы на перспектыву. Я вельмі спадзяюся, што гэты прыклад будзе заразлівым, падцягнуцца іншыя аматары і ўдасца сабраць падобныя каманды, скажам, з тэатральных акцёраў, тэлевізійнікаў і г. д., каб правоздіць матчы паміж імі, каб папулярызаваць баскетбол сярод тых людзей, якія раней не захапляліся гульнёй. Але для гэтага нельга закідаць трэніроўкі, усім хлопцам ёсць куды расці.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

А вы ведалі, што?..

✓ Беларускія баскетбалісткі першымі з усіх зборных выступілі не ў шортах і майках, а ў сукенках (на ЧС-2010), чым выклікалі суцэльнае захапленне ў балельшчыкаў.

✓ У 2008 годзе ўпершыню ў гісторыі летніх гульнявых відаў спорту Беларусь была прадстаўлена на Алімпіядзе ў камандных відах. Наша зборная заняла выніковае 6-е месца.

✓ Паводле неафіцыйнага рэйтынгу заўзятараў, баскетбольная жаночая зборная — самая прыгожая сярод іншых нацыянальных камандаў.



1 2 3 4 5 6 7 8
9 10 11 12 13 14 15 16 17 18 19 20 21 22 23 24 25 26 27 28 29 30 31 32 33 34 35 36 37 38 39 40 41 42 43 44 45 46 47 48 49 50 51 52

Па вертыкалі: 1. Старадаўні абрад прынашэння дароў духам продкаў, багам, святым. **2.** Цеплаабменны апарат паратурбінных установак. **3.** Папяровая вокладка паверх пераплёту кнігі. **4.** Беларускі спявак (лірыка-драматычны тэнар). **5.** Дахавы матэрыял. **7.** Слуп, да якога прымацоўваецца створка варот. **8.** Упаковачная мера сыравіны. **10.** Беларускі асветнік, пісьменнік эпохі Адраджэння. **12.** Таполя дрыжачая. Драўніна ідзе на выраб запалак. **14.** Духавы клавішны музычны інструмент. **15.** Наяўнасць у арганізме прыкмет, якія існавалі ў яго далёкіх продкаў. **19.** Паўночная палярная вобласць зямнога шара. **22.** Друкарскі прагальны матэрыял для павелічэння прамежкаў паміж радкамі тэксту. **24.** Рускі віяланчэліст, дырыжор. Ганаровы член Каралеўскай акадэміі музыкі ў Лондане (1961). **26.** Адзіны бог мусульманскай рэлігіі. **27.** Самы высокі вулканічны масіў Арменскага нагор'я. **28.** Струнны шчыпковы музычны інструмент, падобны да мандаліны. **30.** Сумка, торба. **33.** «Доктар» сельскагаспадарчай нівы. **34.** Гармон мазгавога слоя надныракнікаў. Шмат выдзяляецца пры эмацыянальных нагрузках. **35.** Рыбалоўная снасць у выглядзе конусападобнай сеткі. **38.** Міжнародны дагавор. **39.** Прылада для апрацоўкі скуры, рагоў, косці і дрэва. **40.** Расказ пра незвычайную смешную падзею, сітуацыю, рысу характару чалавека. **42.** Сібірская рака. **45.** Хімічны элемент, сусед гелію і берылію. **46.** Падатак у Рускай дзяржаве XVI — XVIII ст. **48.** Шахматная фігура.

Па гарызанталі: 1. Тып рукапіснага энцыклапедычнага даведніка беларускага сярэднявечча. **6.** Ён жа і асёл. **9.** Працэс набыцця сістэматызаваных ведаў. **10.** Бервяно ці тоўсты брус, умацаваныя вертыкальна. **11.** Варатар, які ў свой час гуляў за каманду «Беларусь» г. Мінска. У 1969-м выконваў абавязкі галоўнага трэнера «Дынама» (Мінск). **13.** Засеянае поле. **15.** Рака на Любаншчыне, апетая Я. Купалам. **16.** Верш Я. Купалы (1908). «Стаў з трудоў гарбаты//Хоць яшчэ не стар//Падбел пабіў пяты//Загарэў увесь твар». **17.** Архітэктурна-канструктыўны элемент крывалінейнага контуру. **18.** Экс-чэмпіён свету па шахматах. **20.** Пакутніца. Яе ўшаноўваюць у студзені кожнага года. **21.** Прыстасаванне для распальвання і падтрымання агню. **23.** Горад у Індыі на р. Джамна. **25.** Паганяты цялят. **29.** Разнавіднасць атамаў аднаго і таго ж хімічнага элемента. **31.** Словазменная катэгорыя іменных часцін мовы. **32.** Машына для распрацоўкі грунту (горнай пароды). **34.** Паэт-імправізатар у народаў Сярэдняй Азіі. **36.** Вайсковае злучэнне з некалькіх батальёнаў або палкоў. **37.** «Вясельны» перыяд у рыб. **39.** «Зорка» беларускага хакея, апошні час гуляў за хакейны клуб Яраслаўля. Загінуў у авіякатастрофе. **41.** Тое, што і гасцінец. **43.** Расліна роду вішня. Гл. здымак. **44.** Рагавы выступ на нагах самцоў некаторых птушак. **45.** Памяшканне, дзе заключылі «саюз» венік з парай. **47.** Тоўстая шоўкавая тканіна з ворсам. **48.** Драўляная або металічная пасудзіна з ручкай для піцця вады. **49.** Птушка, якая лятала ўначы, іншым птушкам смерць насіла. **50.** Плыт для пераправы цераз раку. **51.** Твор, сатырычна або камічна падроблены пад іншы твор. **52.** Высокая цыліндрычная пасудзіна з накрыўкай для вадкасцяў. **53.** Капа сена. **54.** Гэты танец састарэў, гаворыць сёй-той цяпер.

Уладзімір ЕСМАНТОВІЧ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:

Па вертыкалі: 1. Ахвяраранёвашанне. 2. Канадыяграф. 3. Суперфосфарыт. 4. Баёнг. 5. Шыфер. 7. Шуліа. 8. Кліна. 10. Скарына. 12. Асіна. 14. Арган. 15. Атавізм. 19. Арктыка. 22. Шпона. 24. Растрапавік. 26. Алах. 27. Арарат. 28. Домра. 30. Кайстра. 33. Агранам. 34. Адрэнарлін. 35. Нерат. 38. Трактат. 39. Скрабок. 40. Анекдот. 42. Англія. 45. Літый. 46. Ясак. 48. Конь.

Па гарызанталі: 1. Азбукоўнік. 6. Шаўк. 9. Адукацыя. 10. Сруч. 11. Дзяніскенка. 13. Ніва. 15. Арэала. 16. «Арэлі». 17. Арка. 18. Ананд. 20. Варварэ. 21. Анал. 23. Агра. 25. Мажар. 29. Іатон. 31. Скіпон. 32. Экскаватар. 34. Акын. 36. Брыгада. 37. Нерэст. 39. Сагей. 41. Тракт. 43. Чаромха. 44. Шпора. 45. Ланка. 47. Аксаміт. 48. Конаўка. 49. Сава. 50. Парам. 51. Парэдыя. 52. Бітон. 53. Куча. 54. Вальс.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ШОСТЫ ТУР

Яго заданні падрыхтаваны да конкурсу «Пагода ў доме-10» вядучым рубрыкі. У іх патрабуецца перайграць чорных пры першым ходзе белых:



№ 16. **Белыя:** a1, c5, d4, e3, e5, g1, h4 (7). **Чорныя:** a5, b2, c3, c7, e7, f2, f6, g7, h8 (9).

№ 17. **Белыя:** a1, a5, c5, d4, e3, g1, h4 (7). **Чорныя:** c3, c7, e5, e7, f2, f6, g7, h8, дамка b2 (9).

№ 18. **Белыя:** a1, a3, a7, c1, d2, e3, f2, h2, h6 (9). **Чорныя:** a5, b4, c3, d6, e5, f8, g7, h4, дамка c5 (9).

Адказы на працягу двух тыдняў накіроўвайце на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

На перадавых пазіцыях

У мінулым выпуску мы паведамілі вынікі міжнароднага конкурсу «Беларусь-2013». Нагадваем, што кампазіцыі майстра з Жодзіна Аляксандра Ляхоўскага ў катэгорыі А (раздзел задач-64) прынеслі яму першы і трэці прызы. І гэта зусім не выпадкова. Напрыклад, у ЧРБ-16 (2012) ён таксама быў на перадавых пазіцыях: уступіў пальму першынства толькі чэмпіёну свету Анатолю Шабаліну — міжнароднаму майстру з Мінска. За другі паказчык (28, 25 ачка ў агульным заліку) А. Ляхоўскаму заслужана ўручаны сярэбраны медаль. Пазнаёмцеся з яго лепшай задачай у гэтым чэмпіянаце — спаборніцтве высокага рэйтынгу:



Белыя: 8, 9, 10, 14, 17, 18, 25, 30, дамкі 13, 21, 22, 36, 39 (13). **Чорныя:** 32, 38, дамка 2 (3). Замкнуць простую чорных на палях 20 і 45 (7,75 ачка па змесце): 2127 (23А) 3933, 3024, 24, 10 (27) 29#. А (3) 11, 13, 27, 5, 49, 20, 33/6, 35, 40, 50#.

Пераможцы адзначаны

У спаборніцтвах звяздоўскіх рашальнікаў перамаглі: мінчане В. Логвінаў і В. Шульга, А. Камінская з Вілейкі, А. Пярхальскі (Глыбокае) і А. Шурпін з Клімавічаў (аўтарскі конкурс-17 П. Шклудава); А. Белы і П. Шклудаў (Наваполацк), У. Валчкоў (Маладзечна), У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна) і мінчанін А. Літвінаў (аўтарскі-18 В. Шульгі) і І. Ананіч (Гродна), А. Белы, мінчанін В. Варушыла, С. Нячаеў (Баранавічы) і В. Талкачоў з в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна (№ 19 Д. Камчыцкага).

Пераможцы пацвердзілі сваё высокае званне першакласных рашальнікаў. Кожны лаўрэат атрымаў сюрпрыз ад аўтара адпаведнага конкурсу.

Рашэнні

«Пагода ў доме-10» (М. Грушэўскі): **№ 10.** D6, h8, f8, g5!, a1x, **№ 11.** De7, c7, h8, h6, c1 (ab2, d2) c3x і **№ 12.** Fe7, e3, g3, g5, d8, d8:g5:c1:a3:c5:g1#.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 6.33	19.39	13.06
Віцебск	— 6.21	19.30	13.09
Магілёў	— 6.23	19.29	13.06
Гомель	— 6.22	19.24	13.02
Гродна	— 6.49	19.54	13.05
Брэст	— 6.51	19.53	13.02

Месяц

Поўня 9 верасня.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Ганны, Анатоля, Арсенія, Георгія, Дзяніса, Паўла.*
К. *Ірмы, Лукі, Мікалая.*

Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+20..+22°С	КІЕЎ	+22..+24°С	РЫГА	+19..+21°С
ВІЛЬНЮС	+21..+23°С	МАСКВА	+19..+21°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+21..+23°С

УСМІХНЕМСЯ

Здавалася б, навошта забойцу наймаць забойцу, каб забіць забойцу забойцы, які забіў забойцу забойцы, але Данцову было не спыніць...

У міліцыю звяртаецца заплаканая жанчына:

— Знайдзіце майго мужа, я жыць без яго не магу, а ён знік.

— Калі гэта здарылася?

— Тыдзень таму.

— Але чаму вы толькі сёння пра гэта заяўляеце?

— У яго сёння зарплата...

Жанчына, якая доўга думала, што ўзяць — пельмені або эскімо, адмарозіла руку.

caricatura.ru

Даты Падзеі Людзі

1721 год — падпісаны Ніштацкі мірны дагавор. Ён стаў вялікім дасягненнем рускай дыпламатыі, бо вырашыў гістарычную задачу, якая стаяла перад Расіяй з часоў Івана III, — атрымаць выхад да Балтыйскага мора. Ніштацкі мір завяршыў дваццацігадовую вайну паміж Расійскім царствам і Швецыяй, вядомую яшчэ як Вялікая Паўночная вайна. Пасля перамогі Расія ператварылася ў вялікую дзяржаву з сучаснай першакласнай арміяй і магутным флотам на Балтыцы. Швецыя прызнала далучэнне да Расіі паўночнай Латвіі, усёй Эстоніі, абодвух берагоў Нявы, паўднёва-заходняга Прыладажжа, часткі Карэліі і іншых тэрыторый. Такім чынам быў забяспечаны выхад да мора і адноўлены марскі гандаль з Еўропай.

1929 год — нарадзіўся Яўген Аляксандравіч Глебаў, беларускі кампазітар, педагог, народны артыст Беларусі (1973) і СССР (1984). У 1956 годзе скончыў Беларускую кансерваторыю, з 1971-га выкладаў там жа. Аўтар балетаў «Мара», «Альпійская балада», «Выбранніца», шматлікіх опер, сімфоній, араторый, інструментальных п'ес і песень, музыкі да драматычных спектакляў і кінафільмаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1970). Памёр у 2000 годзе.

1941 год — у ходзе Смаленскай бітвы савецкія войскі разбілі групоўку фашысцкіх войскаў у раёне Ельні. Немцы ў паніцы пакідалі баявыя пазіцыі, пачалася перагрупоўка войск. Смаленская бітва знамянальная тым, што ўпершыню ў ходзе Другой сусветнай вайны гітлераўцы былі вымушаны перайсці да абароны, а іх план маланкавай вайны даў сур'ёзную расколіну. За мужнасць і гераізм у гэтых баях чатыром савецкім дывізіям было прысвоена званне гвардзейскіх.



Было сказана

Пётр МСЦІСЛАВЕЦ, рускі першадрукар:

«Нават калі толькі адзін талент будзе каму-небудзь даверан, то належыць не ленавацца, а старанна працаваць, баючыся кары за яго ўтойванне».

НАРОДЖАНЫЯ 10 верасня

Быць майстрам сваёй справы, але не прыцягваць да сябе ўвагі — стыль іх жыцця. Гэтыя людзі свята паважаюць і шануюць традыцыі і вытокі, часцей за ўсё жывуць шчаслівым, запаволеным і спакойным жыццём. Яны практычныя, ведаюць сабе цану, выглядаюць перад усімі вельмі збалансаванымі і па-добраму стабільнымі асобамі; яны часта бываюць кансерватыўнымі, але імкнуцца мець побач арыгінальных людзей, партнёраў і сужэнцаў. Ім нельга дазваляць сабе спыняцца па шляху да мэты, а імкнуцца знаходзіць больш перспектыўныя абсягі для росту і развіцця. Калі яны здолеюць знайсці шчасце ў асабістым жыцці, ім лягчэй будзе адольваць бязладдзе вакол сябе.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.151. Індэкс 63850. Зак. № 3747.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 9 верасня 2014 года.